Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!
Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

15-ты ГОД КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

ОРГАН ЦВК і СНК БССР
XIII ГОД ВЫДАНЬНЯ
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА

АЎТОРАК
29 сакавіка 1932 г.
№ 71 (3460)

Сёньня у нумары

АРТЫКУЛЫ. Перадавы. Рашэньне цэтыўным удзельнікам пасеўнай (4 ст.). («Правда»). І. ФАЛЬКЕВІЧ, П. ТЫЧЫ ЦК ад 26 сакавіка ў калгасныя масы. і культурны рост Закаўкаскіх рэспублі НА, А. КАВАЛЕЎСКІ. Эканамічны лічны камбінат (3 стар.). ік (2 стар). Л. МАНІН. За буйны аб-
Буксірныя брыгады—на адстаючыя вучасткі (1 стар.).
Прапагандысту патрэбна штодзенн кі (2 стар.). ае і канкрэтнае кіраўніцтва партячэй
Ступень падрыхтаванасьці і тэмпы вызначаюць якасьць масавай работы правядзеньня трэцяй бальшавіцкай
Навігацыі—пасустрач. (3 стар.). саветаў (2 стар.).
Павесьці рашучую барацьбу за дзе (3 стар.). йспасьць рабселькораўскага допісу
МТС могуць і павінны выканаць л
Кожны асьвегнік павінен быць акёназагатоўкі (3 стар.).

Адкрыўся II Усебеларускі зьезд працоўных літоўцаў

Учора ўвечары ў Менску адкрыўся II-гі Усебеларускі зьезд працоўных літоўцаў. Зьезд адкрыў старшыня Цэнтральнай Нацкамісіі пры ЦВК БССР т. Гілякевіч. Т. Гілякевіч у прамовепры адкрыцьці зьезду спыніўся на посьпехах сацыялістычнага будаўніцтва і ў працівалегласьць нашаму нечуванаму росту абмляваў становішча ў капіталістычных краінах, дзе эканамічны крызіс з кожным днём пагы-бляецца.

У заключньне сваёй прамовы т. Гілякевіч коратка спыніўся на пытаньнях, якія прыдзецца вырашыць зьезду. У ганаровы прэзыдыум зьезду абіраюцца: Палітбюро ЦК УсеКП(б), т. Сталін, Рудзутак, бюро ЦК КП(б)Б, т. Калінін, прадстаўнікі братэрскіх кампартый т. т. Ленскі, Фостэр, Корчык. На ўчорашнім паседжаньні зьезд віталі прадстаўнікі працоўных літоўцаў Масквы і Ленінграду. Ад Менскага Гарсавету з прывітаньнем выступіў т. Валодзька, ад БДВ—т. Некрашэвіч.

Зьезд пастанавіў паслаць прывітальныя тэлеграмы ЦК УсеКП(б), Пленуму ЦК КП(б)Б, ЦВК СССР і БССР і Рэвваенсавету.

Рашэньне ЦК ад 26 сакавіка ў калгасныя масы

Учора апублікавана пастанова ЦК УсеКП(б) ад 26 сакавіка наконт прымусовага абагульваньня жывёлы. За апошнія 2 гады ў рашэньнях ЦК партыі, у выступленьні т. СТАЛІНА, у рашэньнях XVI партзьезду і XVII партканфэрэнцыі неаднакроць падкрэсьлівалася, што асноўнай, цэнтральнай задачай у галіне калгаснага будаўніцтва на даным этапе зьяўляецца разьвіцьцё і ўмацаваньне арцельнай формы калгасаў. Ужо самы апошні час у пастанове ад 4 лютага г. г., ЦК з асаблівай сілай падкрэсьліў, што арцельная форма калгасаў яшчэ не разгорнута досыць і не замацавана. ЦК зноў і зноў перасьцерагае партыйныя арганізацыі, што «спробы штучнага паскораньня пераходу ад арцельнай формы калгасаў да камуны на сучаснай стадыі разьвіцьця калгасаў зьяўляюцца сур'ёзнай небясьпекай».

І ўсё-такі знайшліся некаторыя арганізацыі і паасобныя работнікі, якія прайшлі міма гэтых зазначэньняў і перасьцеражэньняў, якія, як аб гэтым ужо паведамлялася ў «Правде», у прыватнасьці некаторыя работнікі Парачінскага раёну, Сярэдняй Волгі, парушылі, што «сельгасарцель—гэта ўжо пройдзены этап». Знайшліся разам з тым і такія партарганізацыі, якія не далі своячасовага і рашучага адпору гэтым «лявацкім» тэндэнцыям. Цэнтральны камітэт неаднакроць папярэджаў партыйныя арганізацыі наконт абсалютнай недапушчальнасьці парушэньняў у будаўніцтве, у прыватнасьці наконт недапушчальных парушэньняў статуту сельскагаспадарчай арцелі. І ўсё-ж знайшліся некаторыя арганізацыі міма гэтага папярэджаньня, і нізацыі і некаторыя работнікі, якія падыйшлі да задачы калгаснага будаўніцтва ня так як будаўнікі, а як адміністратары.

Партыя, разьвязаўшы ў асноўным зярнёвую праблему, паставіла разьвіцьцё жывёлагадоўлі як цэнтральную на даным этапе задачу. І вось знайшліся людзі, якія парашылі, што з гэтай справай можна справіцца проста «ў два счоты»: трэба, маў, толькі поўнасьцю абагуліць плямённую і дробную жывёлу, што ёсьць у калгаснікаў. Пры гэтым асаблівай увагі заслугоўвае той факт, што калі супроць гэтых спробаў тых раёнаў, дзе ўжывалися і высоўваліся супярэчаньні, дык звычайна гэтыя супярэчаньні зводзіліся да паказаньня на непадрых таванасьць матар'яльна-тэхнічнай базы для бездакладнага абагульваньня жывёлы і толькі. Няма, маў, абор, няма кармоў, а таму давайце пакуль з абагуленьнем пачакаем. Меркаваньне гэтае важкае і само па сабе правільнае. Але яно мае адзін істотны недахоп.

Дапусьцім, што даная арцель мае і памяшканьні для жывёлы і неабходную колькасьць кармоў. Ці слядуе адгэтуль, што можна прымусова абагульваць жывёлу паасобных калгасьнікаў? Ці ня ясна, што людзі, якія думаюць вырашыць жывёлагадоўчую праблему шляхам прымусовага абагульваньня жывёлы, якая ёсьць у калгасьнікаў, прытрымліваюцца той «палітыкі», якую т. СТАЛІН у свой час ахрысьціў «палітыкай» уцёра ПРЫШЫБЕЕВА? Апроч таго, што за спробамі пераскочыць праз арцель да камуны—тайцца апартуністычнае жаданьне адмахнуцца ад няжкай задачы сацыялістычнага перавыхаваньня калгасьнікаў, абыйсьці яе ў адміністрацыйным шляхам вырашыць гэтыя задачы сацыялістычнай перабудовы вёскі, гэтая справа мае яшчэ і другі бок, бок эканамічны.

Што азначала-б ліквідацыя індывідуальнай часткі гаспадаркі калгасьніка сёньня? Над гэтым вядань, не залучаюцца порсткія адміністратары. Тут гэта азначала-б, што калгасы сёньня павінны былі-б замест арганізацыі вытворчасьці вырашаць задачу цэнтралізаванага снабжэньня калгасьнікаў, вырашаць задаволеньня патрэб калгасьнікаў. Прыйшлося-б перавесьці калгасьнікаў на грашовую заработную плату, для чаго патрэбна было-б дзесяткі мільярды руб. абаротных сродкаў з іншых галін народнай гаспадаркі, бо калгасы не накапілі яшчэ ні дастатковых уласных сродкаў, ні дастатковых натуральных запасаў. Зрыў усяго народна-гаспадарчага плану—вось што было-б вынікам такой «палітыкі».

ЦК неаднакроць, і ў сваёй пастанове ад 4-га лютага г. г. асабліва, перасьцерагаў супроць спробаў перавесьці аплату працы калгасьнікаў на грашовую зарплату, але якая справа да гэтых перасьцярог «леваком», якім «усё па чым», ім і ў недамёк, што ў адміністрацыйным захапленьні яны тапчуць пад дудку клясавага ворага, што яны ў радзе выпадкаў становяцца захвярай адкрытай кулацкай правакацыі.

Задача партыі—у далейшым разгортваньні і ўмацаваньні арцельнай формы сельскай гаспадаркі. Яна, у пры ватнасьці, заключаецца ў тым, «каб у кожнага калгасьніка былі свая карова, дробная жывёла, птушка», каб «арганізаваць дапамогу і садзейнасьць калгасьнікам, якія ня маюць каровы ці дробнай жывёлы, у куплі і выгадаваньні маладняка для асабістых патрэб». Нарэшце, калі ўзяць практыку прымусовага абагуленьня жывёлы калгасьнікаў з пункту гледжаньня задач жывёлагадоўлі, дык з гэтага пункту гледжаньня апартуністычная бліза рукасьць арганізацый, што дапускаюць гэтую практыку, зробіцца відавочнай.

Партыя дасягнула значных посьпехаў у будаўніцтве калгасных таварных фэрмаў. Канцэнтрацыя статку на фэрмах дае вялізарны эфэкт у сэнсе выхаду таварнай прадукцыі. Аднак задача пашырэньня пагалоўя прадукцыйнай жывёлы шляхам вырошчваньня ўласнага прыплоду калгасных фэрмамі ні ў якім разе яшчэ ня вырашана. Больш таго, тэхнічна і гаспадарча яны яшчэ настолькі слабыя, што ўскладзі на іх гэту задачу было-б на мыльковым. Задачу пашырэньня статку і вырошчваньня маладняка ў калгасах сёньня нельга вырашыць без актыўнага ўдзелу ў гэтай справе кожнага калгасьніка. Калгасная фэрма для інкубатарнай станцыі, прадаючы калгасьнікам частку прыплоду (цялят, парасят, куранят), дапамагаючы ім аб завесьціся сваёй уласнай жывёлай, за бясьпечвае гэтым самым вялізарны размах у справе вырошчваньня маладняка.

Але вось ёсьць, аказваецца, такія «гэарэтыкі», якія сьцьвярджаюць што гэта можа прынесьці «вялізарную шкоду справе абагуленьня жывёлы распальваньнем дробна-ўласьніцкіх строяў калгасьнікаў, стварэньнем ілюзіі, што пры калгасе кожны бядняк і серадняк будзе карыстацца паасобнай кароўкай». (Сярэдняволскі часопіс «Аграрнік - марксыст», № 1). Паводле гэтай тэорыі выходзіць, што з дробнаўласьніцкімі настроямі калгасьнікаў няма нічога лягчэй пакончыць, абагуліць жывёлу і ніякай такой спэцыяльнай работы па сацыялістычным перавыхаваньні калгасьнікаў не патрабуецца. Гэта «лявацкая» практыка лішні раз гаворыць аб тым, што ня ўсе яшчэ да канца ўявілі сэнс рашэньня ЦК аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў у іх арцельнай стадыі разьвіцьця, і, у прыватнасьці, не зрабілі тых неабходных вываду і ўказаньняў ЦК аб тым, што арцельная форма калгасаў яшчэ не разгорнута дастаткова і не замацавана.

Задачай усіх партыйных арганізацый зараз зьяўляецца, па-першае, шырокая папулярызацыя пастановы ЦК ад 26 сакавіка сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў і, па-другое, настойлівае правядзеньне яе ў жыцьцё. У прыватнасьці, улічваючы пачатак пасеўнай кампаніі, партарганізацыі абавязаны дамагчыся, каб кожны калгас прадугледзеў такі пасеў кармовых культур, якіх забясьпечыў кармамі ня толькі жывёлу калгасных фэрм, але і жывёлу, што знаходзіцца ва ўласнасьці калгасьнікаў. Неабходна «сьпіць усякія спробы прымусовага абагуленьня кароў і дробнай жывёлы ў калгасьнікаў, а вінаватых у парушэньні дырэктывы ЦК выключыць з партыі». Трэба рашуча пакончыць з «лявацкімі» тэорыямі і «лявацкай» практыкай пераскокваньня праз арцельную форму калгасаў.

Пастанова ЦК адыграе вялізарную ролю ў арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў. Яна паслужыць новым стымулам уздыму пралетарыяцкай актыўнасьці калгасных мас, паскорыць тэмп вырашэньня жывёлагадоўчай праблемы, яна наносіць зьмяшчальны ўдар клясаваму ворагу.

(«Праўда»).

Праф актыў Койданаўшчыны вітае рэарганізацыю раёну ў польскі і на ыянальны

КОЙДАНАВА (па тэлефону ад нашага спэцкора). На гэтых днях адбылася нарада прафактыву Койданаўскага раёну, на якой абгаворвалася пастанова ЦВК СССР аб рэарганізацыі Койданаўскага раёну ў нацыянальны польскі.

Пасьля абгаварэньня гэтага пытаньня нарада паслала прывітальную тэлеграму Прэзыдыуму ЦВК БССР, у якой гаворыцца:

«Нарада прафактыву ад імя трохты сячнай арміі чыгуначнікаў Койданаўскага раёну адабрае і вітае пастанову прэзыдыуму ЦВК БССР аб пераўтварэньні Койданаўскага раёну ў нацыянальны польскі. Гэта пастанова зьяўляецца своячасовай і зусім правільнай у справе ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Нарада прафактыву заверае ўрад БССР, што ўся прафарганізацыя Койданаўшчыны прыме актыўны ўдзел у перавыборах сельсаветаў і прыкладзе ўсе сілы на тое, каб да раённага зьезду саветаў прыйсьці з поўным выкананьнем прамфінпляну па ўсіх паказьніках, а таксама з поўным ахопам рабочых прафсаюзным членствам, вялучы сярод рабочых і служачых культмасавую работу і асабліва работу па інтэрнацыянальным выхаваньні.

Нарада ў парадку рабочага шэфства, узяла на сябе абавязак весьці шырокую работу па дапамозе калгасьнікам у арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, арганізацыі бригад, у наладжваньні вучоту працы у поўным зборы насельніцтва, складаньні вытворча-фінансавых плянаў у калгасах шляхам пасылкі рабочых брыгад і г. д.

У часе перавыбарчай кампаніі саветаў прафактыў абавязаўся разгарнуць шырокую работу па конкурсе «Праўды» і наладжваньні работы насьценгазэт як у сябе на вытворчасьці, а так сама і ў падшэфных калгасах, забясьпечыўшы іх штодзённым выпускам, мабілізуючы вакол насьценгазэт усю рабочую масу і калгасьнікаў на лепшае правядзеньне перавыбараў і поўнае выкананьне ўсіх сельска-гаспадарчых задач, пераносячы лепшы вопыт адных у іншыя прадпрыемствы і калгасы.

Маркаў.

ЗА ГРАНІЦАЙ

НА „МІРНАЙ" КАНФЭРЭНЦЫІ У ШАНХАІ

ПЕРАГАВОРЫ НЯ ДАЛІ ВЫНІКАЎ.

ТОКІЕ. 27-III. Газэта «Ніцы-Ніцы» паведамляе, што перагаворы паміж японскімі і кітайскімі ваеннымі дэлегатамі ў падкамісіі па пытаньні аб тэрміне адыходу японскага войска не далі вынікаў.

„Японскае войска б дзе прыбываць"

ШАНХАЙ. 28-III. Сёньня ўвесь друк адзначае, што работы мірнай канфэрэнцыі амаль бяз вынікаў таму, што японцы згаджаюцца на эвакуацыю з сучасных пазіцый толькі па лініі Усун—Цзяньван—Чапэй і то з агаворкай «калі дазволяць абставіны». Японскія дэлегаты матывуюць свае пазыцыі тым, што гэта тэрыторыя патрэбна для абслугоўваньня арміі колькасьцю ў 50.000 чалавек, пры якой маецца 5000 коняй, бо на меншай і другой тэрыторыі нельга знайсьці адпаведных памяшканьняў. Японцы заяўляюць, што прабываньне японскага войска на гэтай тэрыторыі, маг чыма працягнецца «некалькі тыдняў».

Японія патрабуе спы еньня дзейнасьці кітайскіх снайпэраў

ШАНХАЙ. 27-III. У японскіх колах зазначаюць, што з часу спыненьня ваенных дзеяньняў мелі месца 23 выпадкі нападу снайпэраў на японскія патрулі вакол Шанхаю. Японцы заяўляюць, што ў выніку дзейнасьці снайпэраў забіта 3 і паранена 14 японскіх салдатаў, апроч таго 3 маракі прапалі бяз вестак.

Побач з гэтым японцы заяўляюць, што нібы дзейнасьць снайпэраў ўзмацнецца з кожным днём і ахапіла цяпер ня толькі прыфрантавую лінію, але і распаўсюдзілася на цэнтр японскіх пазыцый, дзе снайпэры нібы, прабавалі забіць вышэйшых чыноў японскай арміі. Японцы зазначаюць, што злавіць снайпэраў амаль немагчыма, бо яны пры напражаемай ім небясьпецы кідаюць сваю зброю і зьліваюцца з масай сялянскага мірнага насельніцтва, а злавіць іх можна толькі ў тым выпадку, калі будуць ужыты самыя суровыя меры да ўсяго кітайскага мірнага насельніцтва.

Японскі дэлегат на мірнай канфэрэнцыі патрабаваў, каб кітайскія ўлады прынялі самыя энэргічныя меры да спыненьня гэтай дзейнасьці.

Японскія афіцэры для манчжурскай арміі

БЭРЛІН. 27-III. Як паведамляе карэспандэнт «Дэйчэ Альгемэйнэ Цэйтунг» з Чаньчуня (Манчжурыя) урад Пу-І патрабаваў ад японскага камандаваньня прысылкі яму 200 японскіх афіцэраў для абучэньня манчжурскай арміі. Апроч таго, у Манчжурыю па вінны быць адкамандыраваны японскія афіцэры для абучэньня манчжурскай паліцыі. Японскі ўрад ужо даў сваю прынцыповую згоду на адкамандыраваньне афіцэраў да Пу-І.

Перагаворы паміж Англіяй і „манчжурскім урадам"

БЭРЛІН. 27-III. Паводле пэўных зестак, паміж англійскімі прадстаўнікамі ў Кітаі і новым манчжурскім урадам пачаліся афіцыяльныя перагаворы аб прызнаньні Манчжурыі.

Англійская ўлада ў Кітаі ў сучасны момант заклапочана лёсам мытных збораў у Манчжурыі, даходы ад якіх ідуць на пакрыцьцё даўгоў Кітаю дзяржавам, у прыватнасьці Англіі.

Перагаворы вядуцца пад кіраўніцтвам сэра Фрэдэрыка Маклі, генэральнага інспэктара і англічаніна Вэйсэ.

У аснову перагавораў пастаўлена пытаньне аб манчжурскіх мытнях і спосабе пакрыцьця мясцовых даўгоў Кітаю даходамі гэтых мытніц. Новы манчжурскі ўрад у прынцыпе згодзен частку мытных даходаў пералічыць на пакрыцьцё замежных даўгоў, але настойвае на тым, каб мытніцы ў Манчжурыі былі прызнаны належачымі да новага манчжурскага ўраду і каб ні якае адміністрацыйнае ўмяшаньне чы было дапушчана ў справы гэтых мытніц з боку галоўнага мытнага кіраўніцтва ў Кітаі.

Ірляндыя дамагаецца поўнага адзяленьня ад Англіі

ЛЁНДАН. 27-III. Сёньня па ўсёй Ірляндыі ірляндзкая рэспубліканская армія арганізуе дэманстрацыі ў памяць Ірляндзкага паўстаньня ў 1915 г. Ірляндзкая рэспубліканская армія выдала загад, у якім гаворыцца, што «час яшчэ ня прыйшоў для таго, каб зьвярнуцца да зброі». У сувязі з гэтым, дэманстрантам прапануецца ня браць з сабой зброі. Рэзалюцыі, якія будуць выносіцца на мітынгах, патрабуюць, каб урад Дэ-Валера дамагаўся ўсімі сродкамі поўнага аддзяленьня ад Англіі. Ірляндзкая рэспубліканская армія заяўляе, што яна мае намер распусьціць сваю арганізацыю нават у выпадку, калі будзе адмененая прысяга на вернасьць Англіі, пакуль не адбудзецца поўнае аддзяленьне Ірляндыі ад Англіі.

Для таго, каб ухіліцца сутычкі з дэманстрантамі, урадаваму войску «Ірляндзкай свабоднай дзяржавы» загадана заставацца ў казарме. Як відаць, пазіцыі ірляндзкай рэспубліканскай армії ствараюць труднасьці для Дэ-Валера, які, бяз усякага сумненьня, імкнецца дасягнуць згоды з Англіяй. Як мяркуюць, ірляндзкая рэспубліканская армія мае ў распараджэньні вялікія запасы зброі і вайсковых матар'ялаў. У адным Дубліне яе абучаныя атрады налічваюць 3.000 чалавек.

У Шіхім акіяне перад бурай

Мал. Я. Кашкеля

Атакі японскіх самалёгаў ня спыняюцца

ШАНХАЙ. 27-III. Паведамляюць, што ўчора адбылася яшчэ адна павет раная атака на Сучжоу, у якой удзельнічала 2 японскіх самалёты. Самалёты скінулі лёгкаважныя бомбы, якія не ўзарвалася, і пачалі кулямётны агонь.

Канцэнтрацыя японскага флёту ў Ханькоу

ШАНХАЙ. 27-III. Адначасова з прыездам Сіракава (камандуючы японскім флётам у кітайскіх водах) у Ханькоу адбываецца канцэнтрацыя японскіх ваенных суднаў, якіх у сучасны момант у Ханькоу знаходзіцца 13. Апроч таго ў бліжэйшы час павінны прыбыць яшчэ 2 судны

Камісія Лігі нацый у Нанкіне

НАНКІН. 27-III. Камісія Лігі нацый сёньня прыбыла ў Нанкін. Камісія на ведала міністра чужаземных спраў і іншых урадавых дзеячоў і арганізацый.

Усеагульная забастоўка ў Гішпаніі

ПАРЫЖ. 27-III. З Гішпаніі паведамляюць, што рух пратэсту супроць спыненьня работ на пабудове чыгункі Заморра-Да-Корунья пашыраецца.

Усеагульная забастоўка ў Арэнсе і Фонтэвекра працягваецца з ранейшай сілай. У Сант-Якаў абвешчана ўсеагульная забастоўка.

У Мадрыдзе абвешчана забастоўка служачых харчовых магазынаў, якія патрабуюць увядзеньня 8-гадзіннага рабочага дня замест існуючага 10—12-гадзіннага, устанаўленьня тыднёвага адпачынку і г. д. Рухам кіруюць камуністы.

Забастоўка гарнякоў у Чэхаславакіі

ПРАГА. Забастоўка вуглякопаў Паўночна-Заходняга вугальнага раёну сёньня пашырылася. Бастуючыя абыходзілі раён, заклікаючы працоўных далучыцца да забастоўкі. На сённішні дзень бастуе 12 шахт з 5.000 рабочых. Дзяржаўная шахта «Гедвіг», якая снабжае вугляём раённую электрычную станцыю ў Заштадзе заняла жандармерыяй і ваеннымі часьцямі, бо станцыя снабжае Прагу сьвятлом і рухаючай сілай.

Паведамляюць, што канфэрэнцыя ка мітэтаў шахт раёну прыняла пастанову аб далейшых мерапрыемствах з мэтай распаўсюджваньня забастоўкі на ўсю краіну. Камуністы спрабуюць узяць чалець рух.

Забастоўка пашыраецца

ПРАГА. 26-III. Забастоўка гарнякоў у паўночна-заходнім вугальным раёне Чэха-Славакіі ахапляе сёньня ўжо 36 шахт з агульнай колькасьцю 17.000 рабочых, г. зн. 70 проц. агульнай колькасьці гарнякоў у гэтым раёне. Уладаі забараніла розныя сходы і мітынгі бастуючых.

Сацыял-фашысцкія прафсаюзы, якія лічуць гэту забастоўку «дзікай» і спрабуюць усімі сродкамі сарваць яе, заранілі сваім членам прымаць удзел у забастовачных камітэтах.

Ня гледзячы на гэта, сёньня адбыліся два вялізарныя мітынгі, у якіх удзельнічала 11.000 рабочых, у тым ліку члены рэфармісцкіх прафсаюзаў. Рэвалюцыйныя рабочыя праводзяць дэманстрацыі, у якіх удзельнічаюць жанчыны і дзеці, па ўсім раёне, і пераконваюць гарнякоў яшчэ працуючых шахт далучыцца да бастуючых.

Канфэрэнцыя чырвонага саюзу маракоў чартавікоў і воднікаў

БЭРЛІН. 27-III. У Гамбурзе адбылася першая канфэрэнцыя чырвонага саюзу маракоў, партавікоў, і воднікаў. Канфэрэнцыя была скліканна на шырокзнай базе адзінага пралетарскага фронту і да ўдзелу ў ёй былі прыцягнуты неарганізаваныя рабочыя і члены іншых прафсаюзаў. На канфэрэнцыю прыбылі делегаты з усіх гарадоў Германіі. Атрыманы тэлеграмы французкіх, галяндзкіх, нарвэскіх, шведскіх, аўстрыйскіх і бэльгійскіх маракоў і партавікоў.

Пралетарыяты кітайскага, японскага і амэрыканскага пралетарыяту выступілі на канфэрэнцыі з прывітальнымі прамовамі. Прывітаньне делегацыі саюзу воднікаў СССР перапрылося ў бурную дэманстрацыю ў абарону Савецкага Саюзу.

Бурж азны друк аб 2-ой пяцігодцы
Капіталісты топчуцца на тонкім лёдзе

ЛЁНДАН. «Манчэстэр Рардыян Комэршыель» у перадавым, прысвечаным другой пяцігодцы піша:

«Кіраўнікі СССР не пазбаўлены ад вагі пры правядзеньні сваіх мэтадаў. У той час, калі лідэры прамысловасьці капіталістычных краін топчуцца на тонкім лёдзе, савецкія ўладары пры пяцьцем другой пяцігодкі паказалі, што яны маюць намер імчацца на канькох наперад да сваёй адважнай праграмы індустрыялізацыі».

Дэкаднік штурму мабілізацыі і сродкаў

БУКСІРНЫЯ БРЫГАДЫ—НА АДСТАЮЧЫЯ ВУЧАСТКІ

На гакідаць запазычанасьці

Да канца першага кварталу засталося некалькі дзён. Гэтыя дні вырашаюць посьпех выкананьня фінпляну па ўсёй Савецкай Беларусі.

Ад поўнага выкананьня пляну мабілізацыі сродкаў першага кварталу залежыць фінансаваньне прамысловасьці і сацыялістычнай сельскай гаспадаркі ў II квартале.

Дэкаднік штурму мабілізацыі сродкаў, абвешчаны ЦК КП(б)Б і НКФ БССР, даў некаторы зрух. Сёньня мы друкуем матар'ялы, якія паказваюць, што дзякуючы правільнаму кіраўніцтву з боку партыйных арганізацый, дзякуючы праведзенай масавай работе і правільнаму зьвязваньню выкананьня пляну па мабілізацыі сродкаў з пад рыхтоўкай да трэцяй бальшавіцкай— некаторыя раёны перавыканалі свой фінплян (Віцебск, Мазыр).

Але ня гледзячы на некаторыя посьпехі, ёсьць рад раёнаў, якія сваёй апартуністычнай бязьдзейнасьцю зрываюць выкананьне фінпляну. Веткаўскі, Барысаўскі, Пухавіцкі, Рагачэўскі і Магілеўскі раёны сваім адставаньнем перапражаюць зрывам поўнага выканаьня рэспубліканскага пляну.

Неабходна прыцягнуць да адказнасьці зрыўшчыкаў фінпляну і выкарыстаць усе сацыялістычныя мэтады барацьбы на фронце мабілізацыі сродкаў. На адстаючыя вучасткі трэба не адкладна паслаць буксірныя брыгады. Зьлёты ўдарнікаў і ўдарніц фінфронту павінны адыгрываць вялізарнейшую ролю ў масавай работе па выкананьні пляну. 1 квартал мы павінны завяршыць пераможна.

Фінплян павінен быць перавыкананы.

Замацаваць дасягнутыя посьпехі

ВІЦЕБСК. 23-III. Плян мабілізацыі сродкаў першага кварталу выкананы на 100,2 проц. 20 сакавіка рад вучасткаў фінансавай сыстэмы перавыканалі свае заданьні. Ашчадкасы зьсканалі плян на 102,3 проц., ЗРК мэтаўстаў па паявых узносах—154 проц., па укладах—227,5 проц., ЗРК пазэйнікаў плян па паёх выканаў на 160 проц. і па ўкладах на 605 проц. Добра справілася са сваім заданьнем акцыўная фабрыка, якая выканала плян на 177 пр. і ЗРК на 110 проц.

Гэтыя перамогі дасягнуты, дзякуючы правільнаму кіраўніцтву партыйнай арганізацыі, шырокаму ўдзелу прафсаюзаў, камсамолу, ударнай работы нізавога друку і перадавікоў фінансавага фронту.

Аднак, нельга сказаць, што ўсе бяз выключэньня арганізацыі справіліся з заданьнем. Частка арганізацый і ўстаноў ня выканалі пляну, маюць даволі глыбокія прарывы. Фінплян па вёсцы па ўсіх плацяжох выкананы ўсяго на 65 проц. Жыллкаапэрацыя, якая спачатку кварталу ўдарна амагалася за фінплян, ганебна здала тэмпы. Яна прыходзіць да другога кварталу з 46,5 проц. выкананьня пляну. ЦРК на здолеў арганізаваць своячасовае выкананьне фінпляну. 59 проц. выканаьня пляну па паёх і 36 проц. па ўкладах—вось ганебныя паказьнікі, з якімі прыходзіць ЦРК да другога кварталу.

Задача арганізацый Віцебшчыны заключаецца дасягнуцьця посьпехі, павысіць тэмпы барацьбы за фінплян у другім квартале чацьвертага завяршаючага году пяцігодкі.

Язэп Чорны.

Вендарскі сельсавет ганебна адстае

Вендарскі сельсавет. Магілеўскага раёну, у галіне мабілізацыі сродкаў працягвае ганебна адставаць. Асабліва трывожнае становішча з выплатай культзбору, плян якога на 10-е сакавіка выкананы толькі на 15,8 проц.

Адна з асноўных прычын невыкананьня пляну зьяўляецца нежаданьне займацца справай мабілізацыі сродкаў. Замест разгортваньня масавай работы і мабілізацыі сіл на поўнае выкананьне фінпляну, сельсавет і праўленьні калгасаў («Сталіна», «Савецкая Беларусь») займаюцца апартуністычнымі разважаньнямі.

Партячэйка і сельсавет замест таго, каб даць адпор падобным разважаньням стаяць у баку ад гэтай зажнейшай работы. Мабілізацыяй сродкаў у сельсавеце абсалютна ніхто не займаецца.

На працягу трох месяцаў гэтае пытаньне нават не абгаварвалася на прэзыдыуме сельсавету.

— «У нас падрыхтоўка да сяўбы, мы рыхтуемся да вясны», — так разважаюць старшыні многіх калгасаў.

Партячэйка і сельсавет павінны зрабіць рашучы пералом у сваёй рабоце, узяўшы бальшавіцкія тэмпы работы па мабілізацыі сродкаў. Дэкаднік штурму прарываў у выкананьні фінансавага пляну ў сельсавеце павінен зьявіцца пераможным дэкаднікам поўнага выкананьня фінпляну першага кварталу.

Д. Алан, А. Глушынскі.

Буксірная брыгада заводу імя Варашылава ў Горшы

Для ліквідацыі прарываў у выкананьні фінпляну першага кварталу ў Воршу прыбыла буксірная брыгада фінармейцаў заводу імя Варашылава (Менск) у складзе т.т. Крывашэйна і Чэрніна.

Праведзенай работай буксірная брыгада дамаглася таго, што Аршанскі мясакамбінат за некалькі дзён дабіўся значнага зруху ў выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў. За 5 дзён работы 80 проц. рабочых камбінату ахоплена калектыўным страхаваньнем, ліквідавана запазычанасьць па пазыцы «3-га рашаючага», ахоплена новых 135 чалавек падпіскай на пазыку. Некалькі дзесяткаў рабочых уцягнуты ў армію ўдарнікаў фінансавага фронту.

(Белта).

Калгасы Неманіцкага, Стахаўскага, Барысаўскага с.-с. выканалі плян на 0 проц.

Плян мабілізацыі сродкаў першага кварталу калгасамі Барысаўскага раёну выкачаны па добраахвотных плацяжох толькі на 10,5 проц., па абавязковых плацяжох на 59,5 проц. Рад калгасаў амаль яшчэ ня прыступілі да выкананьня фінпляну. Так, калгасы Неманіцкага, В. Стахаўскага, Барысаўскага, Перасадзкага, Зачышчанскага, Вялядзкага і Лопінскага сельсаветаў выканалі свае пляны ад 0 проц. да 2 пр.

Гэта гаворыць аб папрозе пасьпяховаму выкананьню пляну першага кварталу ў Барысаўскім раёне. Такое становішча стварылася ў выніку блізкадзейнасьці і безадказнасьці праўленьняў калгасаў за выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў. Такімі ніякі дастаткорага апэрацыйнага кіраўніцтва ходам мабілізацыі сродкаў з боку раённых арганізацый.

Партыйныя і савецкія арганізацыі Барысаўшчыны ў гэтыя дні, якія засталося да канца кварталу павінны мабілізаваць максімум увагі на выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў з тым, каб плян 1-га кварталу ў раёне быў выкананы і перавыкананы.

С.

ЦК КП(б)Б, СНК БССР, Наркамфіну, рэдакцыі газ. „Савецкая Беларусь"

Рапарт

Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі Мазырскі гарсавет заданьне па мабілізацыі сродкаў 1-га кварталу чацьвертага заключнага году пяцігодкі выканаў на 102,8 проц.

Мазырскі гарсавет запэўнівае, што і надалей пад бальшавіцку будзе змагацца за выкананьне фінпляну чацьвертага заключнага году пяцігодкі.

Старшыня гарсавету ВІРШЫЦ.
Члены фінштабу: Абрамовіч, Дэлас, Гафт.
Сакратар гарсавету Ліакумовіч.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

Партыйнае будаўніцтва

Прапагандысту патрэбна

штодзённае і канкрэтн е кіраўніцтва парт'ячэйкі

Пастанова ЦК УсеКП(б) ад 21 сакавіка 1931 году ставіць задачай перад сеткай марксыцка-ленінскага выхаваньня перабудову мэтадаў работы з такім разьлікам, каб ахапіць вучобай усіх членаў і кандыдатаў партыі і паступова ўняць ваць у вучобу беспартыйных рабочых. У АСНОВУ ПЕРАБУДОВЫ РАБОТЫ ПАРТШКОЛ ПАЛОЖАНЫ ПАВАРОТ ІХ ТВАРАМ ДА ВЫКАНАНЬНЯ ВЫТВОРЧЫХ ЗАДАЧ, ЗАДАЧ АЎЛАДАНЬНЯ ТЭХНІКАЙ,—гэта значыць непасрэднай увязкі тэоры тычнага матар'ялу з практыкай барацьбы за прамфінплян, за выкананьне колькасных і якасных паказьнікаў, за разгортваньне сацыялістычнага спа борніцтва і ўдарніцтва і г. д. Апошнія пастановы XIV зьезду КП(б)Б і XVII-й Усесаюзнай партканфэрэнцыі яшчэ больш яскрава акрэсьліваюць гэтыя задачы.

Але сапраўдная перабудова партшкол нямысьліма пры тых адносінах да вылучэньня кадраў прапагандыстаў і кіраўніцтва імі, якія пануюць яшчэ ў многіх партыйных арганізацыях.

Пытаньне аб прапагандысцкіх кадрах зьяўляецца найбольш слабым мес цам ў пастаноўцы работы па партыйнай асьвеце. Прапагандысты, асабліва нізавой сеткі, у большасьці вельмі нізкай кваліфікацыі, і гэта—асноўная прычына дрэннай якасьці работы партшкол. Пры арганізацыі партыйнай вучобы многія партыйныя арганізацыі да вылучэньня кіраўнікоў школ адносіліся фармальна, мэханічна. На прапагандысцкую работу былі вылучаны таварышы слаба падрыхтаваныя, не прашоўшыя нават курсы пры РК. Тыя, якія прайшлі спэцыяльную падрыхтоўку, скарыстаны на іншай, па думцы кіраўнікоў ячэек, «больш важнай» рабоце.

Маладыя кадры прапагандыстаў на працягу ўсёй сваёй работы дапамогі з боку ячэек ня мелі, работа іх не правяралася. Ячэйкі у многіх выпадках ня толькі не дапамагалі, а нават перашкаджалі прапагандыстам працаваць над узьняцьцё сваёй кваліфікацыі тым, што перагружалі іх іншай работай.

У адносінах партячэек да прапагандыстаў трэба дабіцца рашучага пералому. Парт'ячэйкі павінны дапамагчы прапагандыстам карэнным чынам зьмяніць формы і мэтады работы ў адпаведнасьці з пастановамі партыі па гэтым пытаньні. Найбольш правільнымі формамі кіраўніцтва прапагандыстамі трэба лічыць ПРАВЯДЗЕНЬНЕ СЭМІНАРАЎ НЕПАСРЭДНА НА ПРАДПРЫЕМСТВАХ. Пропсэмінары пры РК ня могуць дапамагчы прапагандыстам арыентавацца ў мясцовых ўмовах той ці іншай партшколы, між тым пропсэмінары на прадпрыемствах з посьпехам гэту задачу вырашаюць. Добрыя вынікі таксама даюць ГУРТКІ ПА ПАДВЫШЭНЬНІ КВАЛІФІКАЦЫІ ПРАПАГАНДЫСТАЎ.

Шырока выкарыстоўваючы гэтыя формы работы, вышукваючы іншыя жывыя формы канкрэтнага кіраўніцтва прапагандысцкімі кадрамі, партыйныя ячэйкі даб'юцца неабходнай перабудовы работы сеткі марксыцка-ленінскага выхаваньня.

Прапаганда тэорыі Маркса-Леніна патрабуе сталай падрыхтоўкі прапагандыст ў

Гомель. У парткалектыве Гомельскага чыгуначнага вузла 390 членаў партыі і 120 кандыдатаў. Рознымі відамі партыйнай асьветы ахоплена: членаў партыі 194 і кандыдатаў — 29. Такім чынам па-за вучобай засталося 190 членаў і 91 кандыдат партыі. Але гэтыя лічбы не паказваюць сапраўднага становішча. Сапраўднасьць ідзе яшчэ далей: больш-менш рэгулярна наведваюць заняткі толькі 26 проц. запісаўшыхся. Па сутнасьці гэта азначае поўны провал партыйнай вучобы.

Дзе прычына гэтага провалу?

Асноўная прычына тоіцца ў тым, што пастаноўка работы школ; мэтодыка выкладаньня і прапрацоўка матар'ялу не зацікаўліваюць партыйцаў, тым больш беспартыйных рабочых. Партыйныя школы працуюць «па-старымцу»: міраўнік — чытае матар'ял, слухачы—слухаюць.

Чаму не перабудавана работа школ?

Таму, што прапагандысты ў большасьці слаба кваліфікаваныя, ня маюць спэцыяльнай падрыхтоўкі і вопыту прапагандысцкай работы. Яны ня здольны арганізаваць заняткі так, каб яны цікавілі слухачоў, яны ня здольны ўвязваць прапрацоўваны матар'ял з практычнымі задачамі, якія стаяць перад дэпо ў галіне рэканструкцыі транспарту і іншымі бягучымі задачамі, пастаўленымі перад імі партыяй і ўрадам.

Вось канкрэтны прыклад таго, як вядзецца прапрацоўка рашэньняў XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі і XIV зьезду КП(б)Б. На прапрацоўку гэтай тэмы ў партшколе ячэйкі цэха мощных токаў прышлі толькі 4 слухачы. Кіраўнік Пустошкін пачаў чытаць ім увесь даклад тав. Арджанікідзе. Пад ціхі, плаўны голас чытача, слухачы... заснулі. Непадрыхтаванасьць не дала магчымасьць Пустошкіну жывой гутаркай, канкрэтнымі ілюстрацыямі з жыцьця дэпо зацікавіць слухачоў, мабілізаваць іх на практычную рэалізацыю важнейшых пастаноў партыі

А вось яшчэ некалькі прыкладаў, ілюструючых нізкую кваліфікацыю прапагандыстаў, і нават больш таго —іх палітычную няпісьменнасьць: кіраўнік ВПШ паравозьнікаў тлумачыць слухачам сучаснае становішча ў капіталістычных краінах: «у капіталістычных краінах зараз крызіс. Ён выцякае з росту вытворчых сіл і параджае беспрацоўе, а беспрацоўе параджае крызіс «Такім чынам слухачы ВПШ уявілі сабе крызіс, як нешта, накшталт, курыцы і яйца: ці-то перш зьявілася курыца і парадзіла яйцо, ці-то персі за ўсё з яйца вылупілася курыца.

Кіраўнік другой школы Шчарбакоў ставіць сваім слухачом пытаньне: «для чаго мы праводзім арганізацыйна гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў». Слухач Хімакоў, які выказаў гатоўнасьць адказаць на гэтае пытаньне, выступіў з яўна шкодным, антыпартыйным тлумачэньнем. А кіраўнік мабыць згадзіўся з ім, бо да гэтага «тлумачэньня» больш нічога не дадаў.

Такая вапіючая няпісьменнасьць кіраўнікоў партшкол толькі калечыць маладых членаў і кандыдатаў партыі. Ні ў якім разе не дапамагае ім разабрацца ў асноўных пытаньнях партыйнага жыцьця.

Як-жа гэтыя маладыя кадры прапагандыстаў забясьпечаны кіраўніцтвам з боку бюро партыйнага калектыву і бюро цэхавых ячэек?

Бюро калектыву і бюро цэхавых ячэек не дапамагаюць прапагандыстам узьняць сваю кваліфікацыю, не створаюць для гэтага спрыяючых умоў. Прапагандысты не праходзяць ніякіх сэмінараў, самі нідзе не займаюцца. Прапагандысты часта перагружаюцца іншай работай і гэта не дае ім магчымасьці нават рыхтавацца да правядзеньня заняткаў.

У парткалектыве Гомельскага дэпо ёсьць шмат камуністаў — старых кадраў рэвалюцыі, добра падрыхтаваных, маючых вопыт прапагандысцкай работы. Яны перапружаны іншай работай, а таму ня могуць быць скарыстаны на сталай прапагандысцкай рабоце. Але вельмі карысна і патрэбна прыцягваць іх да правядзеньня асобных заняткаў у партшколах.

Парткалектыў Гомельскага дэпо мае ўсе магчымасьці арганізаваць у сябе прапсэмінары, або спэцыяльны гурток па падвышэньні тэарытычнага ўзроўню прапагандыстаў. Да кіраўніцтва прапсэмінарам ці гурткам павінны быць прыцягнуты вопытныя прапагандысты.

Гэтыя мерапрыемствы зьявяцца вялікім крокам наперад па шляху вырашэньня праблемы кадраў для сеткі марксыцка - ленінскага выхаваньня.

М.

Работа сеткі парт сьветы не перабудавана

ПОЛАЦАК (наш. кар.). З часу выданьня пастановы ЦК УсеКП(б) аб перабудове партыйна-масавай работы прайшоў ужо год. Але частка ячэек Полацкай партарганізацыі не скарыстала гэты час для сапраўднага павароту сеткі партасьветы тварам да вытворчасьці. Вялікая колькасьць кандыдатаў і новых членаў партыі застаецца да гэтага часу на-за вучобай. Слаба працуюць зьменныя партшколы і амаль нічога ня зроблена для арганізацыі зьвеньневых і групавых партшкол. Асабліва дрэнная справа з прапагандыцкімі кадрамі, якія вельмі слаба падрыхтаваны і ў сваёй штодзённай работе амаль не атрымліваюць дапамогі з боку бюро ячэек.

Парт'ячэйка Полацкай друкарні пытаньнем перабудовы работы сеткі партасьветы, у адпаведнасьці з пастановай ЦК УсеКП(б) ад 21 сакавіка 1931 году, не займалася. Пры друкарні арганізавана толькі адна партшкола. Але і яна ўвесь час працавала вельмі слаба, апошнія-ж некалькі месяцаў зусім ня зьбіралася. У ячэйцы 50 проц. складу кандыдатаў. Ёсьць такія, якія ўжо больш году ня пераводзяцца ў члены партыі з-за непадрыхтаванасьці. Партыйцы ў друкарні не адыгрываюць вядучай ролі, а некаторыя нават зусім ніякай ролі не адыгрываюць (Дзл, Нескуповіч, Гуткін і інш.). Бюро-ж ячэйкі на працягу некалькіх месяцаў не выкучала ў партшколу кіраўніка, што і паслужыла прычынай поўнага провалу партвучобы. На лепшае становішча ў друкарні і з комсамольскай палітвучобай.

У парт'ячэйцы саюзу будаўнікоў 44 чалавекі. З іх—10 кандыдатаў і 17 з партыйным стажам—1-2 гады. Між тым партшкола пры ячэйцы не працуе і работы з новымі папаўненьнямі ніхто не вядзе.

Такое-ж становішча і ў ячэйках леспрамгасу і райпрамсаюзу. Тут кіраўнікамі партшкол вылучаны зусім безадказныя таварышы (Сьляскі, Додзін), якія проста не зьяўляюцца для правядзеньня заняткаў і тым зрываюць работу школ.

Полацкаму РК КП(б)Б трэба ў першую чаргу зьвярнуць ўвагу на падрыхтоўку прапагандыстаў—рабочых з вытворчасьці, якія-б здольны былі ўвязваць прапрацоўваны матар'ял з канкрэтнымі задачамі прадпрыемства. Гэты вучастак работы ў пастаноўцы марксыцка-ленінскага выхаваньня ў Полацкай партарганізацыі самы слабы. Між тым, сапраўдная перабудова работы партшкол нямысьліма бяз узьняцьця кваліфікацыі прапагандысцкіх кадраў

АСТРЭЙКА Я. З.

Арганізаваны сыгнальныя пасты

Для ўзмацненьня тэмпаў загатоўкі сьвіных скур, Жытнавіцкім райкаасаюзам, пры дапамозе загадчыка загатоўчай канторы «Скурсаюзу», у Людзяневіцкім сельсавеце арганізаваны 5 здымальных пунктаў.

Да пунктаў прымацаваны асобныя сельсаветы, якія разьбіты на дзесяці дворкі. Дзесяцідворкі ўзялі на сябе абавязан праводзіць масава-растлумачальную работу па сваіх дварох і да магчыся стопроцантнага выкананьня здыманьня і здачы дзяржаве сьвіных скур.

„Усіх ахапіць партвучобай нельга"

РАГАЧЭЎ. Дырэктыва ЦК КП(б)Б аб 100 проц. ахопе ўсіх членаў і кандыдатаў партыі партыйнай вучобай па гарадзкой парт. арганізацыі ня выканана.

У ячэйцы будаўнікоў партвучобай ахоплена толькі 80 проц. партыйцаў, у ячэйцы каапустаноў—82 проц., райкам бінапу—50 проц., з 13 членаў і кандыдатаў партыі райміліцыі—толькі 4 чал. ахоплены партвучобай, з 10 членаў партыі чыгуначнай парт'ячэйкі ППР—15 не ахоплена партвучобай ніводнага

Недастатковы ахоп партвучобай сакратары гэтых парт'ячэек тлумачаць, тым, што «усіх ахапіць партвучобай нельга». РК-КП(б)Б на апаратыстычныя адносіны да партвучобы адпаведным чынам не рэагуе. (Белта).

Ступень падрыхтаванасьці і тэмпы прявядзеньня трэцяй бальшавіцкай

вызначаць якасьць масавай работы саветаў

Саветы--штабы бальшавіцкага правядзеньня 3-й калгаснай

Роля саветаў у правядзеньні веснавой пасеўнай—вялізарна. Ва ўсёй пад рыхтоўчай рабоце, якая зараз праводзіцца па БССР, у большасьці раёнаў, сельсаветы пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый прыступілі да разгортваньня работы па падрыхтоўцы да сяўбы. Матар'ял, які зёньня друкуецца, гаворыць, аднак, аб тым, што ў радзе раёнаў і сельсаветаў у асноўных важнейшых вучастках работы па сяўбе ёсьць значныя прарывы. У першую чаргу гэта тычыцца важнейшага зьвяна падрыхтоўчай работы—засыпкі насеньня.

Усе весткі з ЖЛОБІНСКАГА раёну, МЕНСКІХ прыгарадных гаспадарак, ПЕРШАМАЙСКАГА сельсавету, Слуцкага раёну і г. д. гавораць аб адным, іменна аб тым, што сельсаветы вельмі мала працуюць для мабілізацыі ўнутраных насенных рэсурсаў і стварэньня страхавых фондаў. Яшчэ горш абстаіць справа з ачысткай насеньня і рамонтам інвэнтара якраз на тых вучастках работы, на якіх вырашаецца лёс СВАЯЧАСОВАГА правядзеньня сяўбы.

Другая сэсія ЦВК БССР указала на тое, што асноўная ўвага сельсаветаў павінна ўдзяляцца ў сучасны момант пытаньням канкрэтнага кіраўніцтва калгаснай вытворчасьцю, арганізацый на-гаспадарчым умацаваньнем калгасаў. З пункту гледжаньня пасьляховага правядзеньня сяўбы гэта работа зьяўляецца рашаючай. Аднак, сёньня мы падаем ілюструючыя факты, якія сьведчаць аб тым, што ва многіх сельсаветах пляны сяўбы ня складзены, калгасьнікі не разьбіты на брыгады, а ў некаторых мясцох пляны не абгавораны на вытворчых нарадах і сэкцыях сельсаветаў.

Адставаньне раду раёнаў тлумачыцца тым, што пытаньнем сяўбы сельсаветы надаюць мала ўвагі, ў асаблівасьці па аднаасобным сэктары (ЖЛОБІНСКІ раён), што пытаньні сяўбы ў многіх мясцох ня сталі ў цэнтры ўвагі. Адсутнасьць масавай работы сэкцый, дэпутацкіх груп, слабая работа дэлегацкіх сходаў жанчын, марудная рэарганізацыя КСУ—яшчэ больш паглыбляюць адставаньне раду сельсаветаў у гэтай важнейшай гаспадарча-палітычнай рабоце, якой зьяўляецца сяўба.

ПЫТАНЬНІ СЯЎБЫ ПАВІННЫ СТАЦЬ ЦЭНТРАЛЬНЫМІ ДЛЯ СЕЛЬСАВЕТАЎ. Разгортваючы сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва, наладжваючы канкрэтнае кіраўніцтва арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньнем калгасаў—саветы павінны ўзначаліць практычную работу па падрыхтоўцы да сяўбы.

Засыпка і ачыстка насеньня, рамонт інвэнтара, расстаноўка рабочай сілы—вось тыя важнейшыя зьвенні, за якія зараз трэба ўхапіцца.

Саветы павінны быць штабамі бальшавіцкага правядзеньня 3-й калгаснай!

У выніку добрага кіраўніцтва

Славінскі сельсавет і партыйная ячэйка гэтага сельсавету за апошні час узялася актыўна за работу па веснавой пасеўнай. Нядаўна сельартэлям склікаў партыйна-камсамольскі актыў, на якім была абгаварана пастанова ЦК КП(б)Б аб веснавой пасеўнай кампаніі і маршруты агра-паходу. Нарада вылучыла адказных брыгадзіраў па ўсіх калгасах і вёсках, якія ўжо прыступілі да работы.

Пленум сельсавету пасьля абгаварэньня пытаньня аб сяўбе мабілізаваў увесь актыў на падрыхтоўчую работу з такім разьлікам, каб да 1-га красавіка поўнасьцю скончыць ачыстку насеньня і рамонт інвэнтара. На пленуме быў абраны штаб з 5 асоб, якому даручана апэрацыйнае кіраўніцтва сацпаборніцтвам па сельсаветах. 300 чалавек самаабавязацельства і ўжо прыступілі да работы па зборы попелу і ачыстцы насеньня. Трэба адзначыць, што вялікую ролю ў справе падрыхтоўкі да сяўбы адыгрывае ў сельсавеце сетка партыйнай асьветы. Добрае наведваньне заняткаў і разбор актуальных тэм спрыяюць таму, што партыйны і калгасны актыў удзельнічае ў падрыхтоўчых работах да веснавой пасеўнай. Не адстае і камсамольская арганізацыя. З ліку камсамольцаў Славінскай ячэйкі 25 чалавек абвясьцілі сябе ўдарнікамі ў правядзеньні конкурсу «Правды».

Дрэнна працуюць дэлегацкія сходы жанчын. Кіраўнік дэлегацкіх груп т. Пасюдзін, які адначасова зьяўляецца сакратаром сельсавету, усяк адмаўляецца ад гэтай работы, а між тым удзел жанчын у гэтай рабоце зьяўляецца вельмі часта рашаючым момантам. Таксама дрэнна абстаіць справа ў масавай рабоце сэкцый сельсавету, якія яшчэ ня ўключыліся ў работу па падрыхтоўцы да веснавой сяўбы.

У. В.

„З вызваскай гною пасьпеем, а цяпер трэба крышку адпачыць"

Падрыхтоўка да трэцяй бальшавіцкай сяўбы па Першамайскім сельсавеце. Слуцкага раёну, праходзіць слаба. Насеньне засыпана на 84 проц. Асабліва адстаюць у засыпцы насеньня калгасы «Зара»; «Чырвоны ўдарнік», «Чырвоная зьмена»; і імя Леніна. Толькі 2 калгасы прыступілі да ачысткі насеньня: гэта «Пралетарская рэвалюцыя» і «Чырвоная ніва». Рамонт інвэнтара праходзіць такімі-ж тэмпамі. Калгас «Чырвоная ніва» да сёньняшняга дня яшчэ ня прыступіў да рамонту. Месячнік рамонту каня не праводзіцца і коні выкарыстоўваюцца ўсімі, каму толькі хочацца: на калгасных конях едуць на вечарынкі, робяць частыя прагулкі ў горад і г. д.

Малюнак дрэннага становішча пад рыхтоўчай работы да сяўбы па Першамайскім сельсавеце будзе яшчэ больш выразным, калі дадаць, што да сучаснага моманту фуражныя фонды ня створаны, а дзе і былі створаны, дык там яны разбазарваюцца. Вытворча - фінансавыя пляны складзены толькі ў 3 калгасах. Да вываз кі мінэральных угнаеньняў і гною яшчэ ня прыступлена. Горш за ўсё тое, што мясцовыя партыйныя і камсамольскія арганізацыі імкнуцца апраўдаць сваю бязьдзейнасьць: Так, сакратар камсамольскай ячэйкі калгасу «Чырвоная ніва» т. Мукасей кажа: «мы многа і за мінулае лета напрацаваліся. З вызваскай гною пасьпеем і вясной, а цяпер трэба крышку адпачыць». Сакратар ячэйкі ЛКСМ калгасу «Пралетарская рэвалюцыя» Карпучок Я. нічога ня робіць для таго, каб камсамольская ячэйка абмеркавала гэтае пытаньне і практычна ўзялася за падрыхтоўчую работу да сяўбы.

Партыйная арганізацыя нібы працуе, але гэта робіцца бяз усякай піва навасьці. Часта парт'ячэйка пасылае людзей туды, дзе яны зусім непатрэбны. Сельскі савет займае адваротную пазыцыю: ён зусім не дапамагае асобным калгасам. Старшыня сельсавету т. Гузьней нядбайна адносіцца да сяўбы, разважаючы так. «навошта нам пасылаць людзей у калгасы; там і самі справяцца». Гэта гаворыць за тое, што сельскі савет адмаўляецца ад канкрэтнага жывога кіраўніцтва і што партыйныя і камсамольскія арганізацыі недаацэньваюць усёй важнасьці падрыхтоўчай работы да сяўбы. Камсамольскія арганізацыі ня ўвязваюць падрыхтоўчай работы з кампаніяй абмену камсамольскіх білетаў

Першамайскі сельсавет і партыйная арганізацыя павінны падрыхтоўку да сяўбы рашуча пераключыць на сапраўдныя бальшавіцкія тэмпы.

Веснавы.

У Жлобінскім раёне ігнаруюць бядняцка-серадняцкія гаспадаркі

(Жлобін, наш кар.).

У гэтую пасеўную кампанію аднаасобны сэктар павінен будзе засеяць па раёне больш 60 проц. яравога клину. Зусім зразумела, што недаацэнка гэтага факту з боку раённых арганізацый і сельсаветаў у час падрыхтоўчай работы да сяўбы можа прывесьці да провалу. Між тым становішча ў раёне ў гэтых адносінах зьяўляецца катастрафічным. Раённыя арганізацыі яўна ігнаруюць аднаасобнікаў, беднякоў і сераднякоў у гэтай важнейшай гаспадарча-палітычнай кампаніі.

Падамо некаторыя факты: з 22 сельсаветаў пляны сяўбы распрацаваны і даведзены да насельніцтва толькі ў 12 сельсаветах. Да засыпкі страхавых фондаў па збожжавых культурах па 25-е сакавіка прыступілі толькі 5 сельсаветаў (плян 2.864 цнт.—засыпана 104 цнт.). Засыпку страхавых тэхнічных фондаў распачалі 7 сельсаветаў (плян 330 цнт.—засыпана 82 цнт.). Вялікі плян зерначысткі па аднаасобным сэктары зусім дрэнна выканаецца: з 23.888 цнт. па плане, ачышчана толькі 3.187 цнт. Зусім не распачалі зерначыстку В.-Альбінскі, Стрэшынскі, Затонскі, Вухарынскі, Лукаўскі, Чацьвярыцкі і Скапінскі сельсаветы. Зерначышчальныя абозы стаяць без работы, а дзе і працуюць, дык ня поўнасьцю. Яўна ігнаруецца таксама справа вывазкі гною з збору попелу на мясцох. Райземаддзел ня мае нават вестак аб гэтай рабоце.

Відавочна, што такое становішча з падрыхтоўкай да сяўбы ў аднаасобным сэктары надалей нецярпіма. Ігнараваньне аднаасобніка-бедняка і серадняка зьяўляецца горшым відам праяўленьня правага апартунізму на практыцы, вядучага да поўнага провалу пасеўнай кампаніі ў Жлобінскім раёне. Трэба безадкладна напрыгадзіць правал, узмацніць барацьбу з кулаком і яго агентурай. Разгарнуць шырокую масавую работу з аднаасобнікамі, бедняка мі і сераднякамі—задача ўсіх парт. ячэек і сельсаветаў Жлобінчыны.

Закрэўскі.

Пакідаюць арганізацыю брыгад да выхаду ў поле

Пытаньне падрыхтоўкі да сяўбы не знайшло належнага адбітку ў рабоце Чарнянскага сельсавету, Шклоўскага раёну. Да гэтага часу нічога ня зроблена па мабілізацыі мясцовых насенных рэсурсаў, як сярод калгасаў, так і сярод аднаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Страхавыя фонды ня ўсюды створаны. З 6 калгасаў па сельсавеце фонды створаны толькі ў калгасах «Шлях пралетарыяту» і «Орка». Ачыстка насеньня, а таксама і рамонт інвэнтара не пачаты. У калгасе Карла Маркса і камуне імя Молатава плугі і калёсы знаходзяцца пад сьнегам. Мі нэральнае ўгнаеньне ніводзін калгас па сельсавеце ня вывез.

Недастатковая работа па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў дрэнна адбываецца на падрыхтоўчых работах да веснавой сяўбы. Яшчэ ў калгасах панае абязьлічка ў догляне за жывёлай і за інвэнтаром. Да гэтага часу рабочая сіла не разьбіта на брыгады. Чакуецьці чакаюць, калі ўжо зьявіцца прыўка. Старшыня калгасу «Орка» тав. Аляхновіч кажа, што яму «немагчыма цяпер разьбіваць людзей на брыгады. Перад выхадам у поле гэта будзе зроблена». Камітэт узаемадапамогі тамсамо ня рыхтуецца да вясны. У свой час гэты камітэт раздаў насенных матар'ялаў 25 тон, а сабраў толькі 4 тоны. З наяўных машын ня створаны абоз па ачыстцы насеньня.

Шклоўскі раённы РВК, партыйная арганізацыя і актыў Чарнянскага сельсавету павінны дамагчыся рэзкага пералому ў рабоце. На аснове разгортваньня сацпаборніцтва і ўдарніцтва паміж калгасамі ў бліжэйшыя дні скончыць важнейшыя падрыхтоўчыя работы да трэцяй бальшавіцкай.

С. Прымежны.

Шэфы--на дапамогу сяўбе

(На пленуме Менгарсавету)

Пленум Менскага гарсавету разгледзеў пытаньне аб падрыхтоўцы да трэцяй бальшавіцкай вясны ў менскіх прыгарадных гаспадарках.

На сёньняшні дзень прыгарадныя гаспадаркі Менску поўнасьцю да сяўбы яшчэ не падрыхтаваліся.

Насенныя фонды па бульбе створаны на 82,4 проц., па зярнёвых культурах—на 93 проц. Поўнасьцю засыпаны насенныя фонды толькі ў 4-5 сельсаветах. Па травах аднагадовых насеньне загатоўлена ўсяго на 6,3 проц., па шматгадовых на 36,6 проц. Па гародніне насенныя фонды створаны толькі на 27 проц.

Рад сельсаветаў чакае завозу насеньня з іншых месц, хоць у Менскім раёне яго ёсьць досыць. Патрэбна толькі правесьці належную растлумачальна-масавую работу сярод калгасьнікаў і асабліва сярод бядняцка-серадняцкай масы насельніцтва. Аднак, сельсаветы гэтай работай не займаюцца, а калі што-небудзь і робяць у гэтым напрамку, дык гэтая работа недастатковая.

Дрэнная справа з засыпкай насеньня ў прыгарадных саўгасах. Саўгаспрэсты часта ня ведаюць оёлетніх кантрольных лічбаў па сяўбе. Рад трэстаў зусім яшчэ не пачаў рыхтавацца да сяўбы. У выніку насенныя фонды па саўгаснай сыстэме створаны ўсяго на 20 проц.

Гэтае ганебнае адставаньне прымушае біць трывогу. Пры такіх адносінах з боку саўгаспрэстаў можа стварыцца пагроза зрыву сяўбы ў менскіх прыгарадных гаспадарках.

Зусім дрэнна абстаіць справа са складаньнем вытворчых пляноў. У многіх калгасах і саўгасах гэтых пляноў на сёньняшні дзень няма. Трэба дадаць, што ў распараджэньні Менскага раёну ёсьць 450 аграномаў працуючых у нарысамітах і раённых установах, якія ў пераважнай большасьці маюць вышэйшую ці сярэднюю агранамічную адукацыю. Аднак, з гэтых 450 чалавек толькі маленечкая група прымае ўдзел у складаньні вытворчых пляноў трэцяй бальшавіцкай вясны. Астатнія-ж агранамічныя ня зьяўляюць ніякай увагі на дапамогу ў падрыхтоўцы да складаньня іх. Зусім слабая ўвага надаецца падзыпэньню ўрэ джайнасьці.

Нельга прайсьці міма равыіцьця конягадоўлі, якая мае вялікае значэньне як у падрыхтоўцы і правядзеньні веснавой сяўбы, так і ў галіне забесьпячэньня абароназдольнасьці нашай краіны. Выходзячы з гэтага пленум указаў павялічыць плян равыіцьця конягадоўлі на 10 проц.

Асаблівую ролю ў падрыхтоўцы і правядзеньні трэцяй бальшавіцкай павінна адыграць рабочае шэфства над калгаснай вёскай. Трэба адмовіцца ад паралельнага шэфства. Неабходна канкрэтнай дапамогай высылкай брыгад для рамонту інвэнтара, канкрэтным удзелам у стварэньні вытворчых пляноў, пасылкай буксірных брыгад машынна трактарнага гораду Менску дапамагчы падшэфным прыгарадным гаспадаркам выканаць вялікую адказную задачу—часьпяховую падрыхтоўку і правядзеньне веснавой сяўбы III-й бальшавіцкай.

А.

І. Фалькевіч, П. Тычына, А. Кавалеускі

ЭКАНАМІЧНЫ і КУЛЬТУРНЫ РОСТ Закаўкаскіх рэспублік

Праўленьне Украінскай Савецкай Энцыклёпэдыі, складаючы плян выданьня слоўнікаў у 1932 годзе (акадэмічных, тэрміналёгічных, чужаземных слоў, тлумачальных і г. д.), рашыла таксама выдаць усходнія слоўнікі: цюркска (Азэрбайджан) —украінскі, грузіна - украінскі і армяна - украінскі.

Аб гэтым былі паведамлены Народныя камісарыяты Асьветы рэспублік Закаўкаскай фэдэрацыі. Наркамасьветы паказаных рэспублік, вітаючы ініцыятыву Украіны ў справе выдань ня слоўнікаў, адзначаючы неабходнасьць і своячасовасьць выданьня такіх слоўнікаў, запрасілі да сябе прадстаўнікоў УСЭ для абгаварэньня і практычнага канчатковага вырашэньня гэтага пытаньня.

Для гэтага былі камандыраваны ў Баку, Тыфліс і Эрывань т. т. акад. Тычына П., проф. Фалькевіч І., праф. Кавалеўскі А.

Дэлегацыі, акрамя гэтага, было даручана паінфармаваць рэспублікі Закаўкаскай фэдэрацыі аб становішчы работы па ўсходазнаўству на УССР, аб рабоце ў галіне пераводаў і выданьня літаратуры на ўкраінскай мове народаў Закаўкаскай фэдэрацыі, паінфармаваўшы аб рабоце выданьня слоўнікаў на Украіне і прыняць удзел у абгаварэньні пытаньня правядзеньня дэкадніка культуры народаў Закаўкаскай фэдэрацыі на Украіне.

Дэлегацыя сустрэла гарачы і брацкі прыём з боку партыйных і савецкіх кіраўнікоў, з боку друку, навуковых працаўнікоў, літарганізацый і культурных навучальных устаноў.

Ініцыятыва УССР у справе выданьня слоўнікаў на цюркскай, грузінскай, армяна - украінскай мовах была прызнана і ацэнена, як справа вялікай палітычнай і культурнай важнасьці, якая паглыбляе брацкія ўзаемаадносіны народаў Савецкага Саюзу і пра цягвае работу органаў УССР, у прыватнасьці, у галіне культуры ў гэтым напрамку.

Рад дакладаў членаў дэлегацыі на розных сходах і нарадах па пытаньнях пастаўленых задач, якія былі мэтай прыезду дэлегацыі, выклікалі да сябе з боку ўсіх прысутных вялікую увагу. Наркамасьветы і арганізацыі аднесьліся да выкананьня работы па падрыхтоўцы і выданьні слоўнікаў, як да ўдарнай задачы і ўзялі на сябе абавязацельства не пазьней 1-га лістапада 1932 году падаць УСЭ канчатковы падобраную, падрыхтаваную і адрэдагаваную картатэку ў колькасьці 30.000 слоў, з неабходнай для гэтага фразэалёгіяй цюркскай, армянскай і грузінскай мовы для кожнага слоўніка. Азэрбайджан выклікаў Грузію і Арменію на сацспаборніцтва, на лепшае выкананьне гэтай работы. Грузія і Арменія прынялі гэты выклік і ўсе тры рэспублікі абралі сваім арбітрам газэту Закаўкаскага райкому ВКП(б) і ЦВК ЗСФСР «Заря Востока». Работа гэта ўжо пачалася. Наркамасьветы рэспублік адпусьцілі неабходныя для гэтага сродкі. Між УСЭ і Наркамасьветамі складзены дагаворы, у якіх прадугледжаны абавязацельства кожнага боку, парадак, умовы і тэрміны выкананьня работы. Усе тры слоўнікі павінны быць выданы не пазьней 1-га студзеня 1933 г.

У часе знаходжаньня ў рэспубліках Закаўкаскай фэдэрацыі дэлегацыя мела магчымасьць шырока азнаёміцца з грандыёзным гаспадарчым і культурным будаўніцтвам, грандыёзнымі дасягненьнямі працоўных гэтых рэспублік. Разгорнутае сацыялістычнае будаўніцтва, нячуваны рост культуры зьдзіўляе і захапляе. Вялікая колькасьць навучальных устаноў з шматлікім студэнцтвам народаў Азэрбайджану, вялікая колькасьць навуковa - дасьледчых устаноў у Азэрбайджане, сярод якіх пачэснае месца ў справе разьвіцьця пралетарскай цюркскай культуры і навуковай работы займае Азэрбайджанскі навукова-дасьледчы інстытут (АЗГНІ), з яго вялікай работай па складаньні слоўнікаў; вялікая тэатральная культура—цюркская опэра, якая мае асабліва важнае значэньне, прымаючы пад увагу, што ў Турцыі опэры яшчэ зусім няма, а таксама цюркскі мастацкі драмтэатр і асабліва цюркскі рабочы з моцным акцёрскім калектывам і мастацкім кіраўніцтвам, з вялікай тэатральнай культурай, агульна - дзяржаўны музэй з аддзеламі: эканамічным, гісторыка - этнаграфічным, біялёгічным і мастацкім. Шырокае разьвіцьцё школьнай работы, якая забясьпечвае выкладаньне на цюркскай мове і на мовах нацыянальных меншасьцяй — усё гэта стала магчымым, дзя куючы вялікаму Кастрычніку, на тай магутнай пралетарскай базе, гранды ёзнага росту прамысловасьці, у прыватнасьці, а асабліва нафтавай, якая выканала першую пяцігодку ў 2 з паловай гады, паставіла Савецкі Саюз па нафце на другое месца ў сьвеце. Вялікая работа ва ўсіх галінах навукі, выданьне Маркса, Энгельса, Леніна, Сталіна на цюркскай мове, выданьне слоўнікаў, выданьне шматлікай літаратуры на пытаньнях марксызму і ленінізму, характарызуе вялікую і адпаведную запатрабаваньням работу Дзяржвыдавецтва АССР. Вялізарнейшае разьвіцьцё цюркскай літаратуры на базе бесьперапыннага росту цюркскага пралетарыяту, а так сама пераводнай літаратуры сьведчыць таксама аб росьце цюркскай культуры.

Зьдзіўляе грандыёзнае гарадзкое і камунальнае будаўніцтва, якое абсалютна мяняе твар Баку, ператвараючы яго ў сацыялістычны горад

Дэлегацыя таксама шырока азнаёмілася з гаспадарчым і культурным будаўніцтвам Грузіі. Тут, па-першае, можна бачыць будаўніцтва зусім новага гораду, дзе разьмешчана шмат навучальных і навуковых устаноў, інстытутаў, як, напрыклад, зоатэхнічны, сельска - гаспадарчы, хімічны, інстытут рацыяналізацыі і г. д. Тутразьбіваюць вялікі зоапарк. Вялізарнейшы рост прамысловасьці, новая; пабудаваная ў 1927 годзе электрастанцыя ЗАГЭС ужо не забясьпечвае электраэнэргіяй, зараз ідзе будаўніцтва па пашырэньні гэтай электрастанцыі, што павялічыць яе сілы на 24 тыс. кілёват. Цікавую і вялікую працу вядзе музэй, разьмешчаны зараз у новым і добрым памяшканьні, з аддзеламі: гісторыка - этнаграфічным, біялёгічным, літаратурна - мастацкім і г. д., —па зьбіраньні каштоўнасьцяй грузінскай культуры. Так, напрыклад, там сабрана каля 40 тысяч рукапісаў кніг з пачатку VII веку і кожны з гэтых экзэмпляраў прадстаўляе унікум ці рэдкасьць. Ня малую колькасьць каштоўных рукопісаў вывезьлі за граніцу меншавікі, дзе прадалі іх. Вялікая тэатральная культура і шырокае разьвіцьцё тэатру. На жаль самы багаты тэатральнай культурай і сіламі драматычны тэатр імя Руставелі адстае ад запатрабаваньняў сёньняшняга дня і стаіць на фармальных пазыцыях. Яго опэктаклі, блескучыя формай, ідэалёгічна не адказваюць запросам пралетарскага глядача, у той час, калі гэты тэатр мае магчымасьць перабудаваць: яго артыстычны калектыў магутны, відомыя рэжысэрскія сілы і карыстаецца ён увагай усіх органаў і арганізацый

Найбольшае захаплень

Павесьці рашучую барацьбу за дзейснасьць рабселькораўскага допісу

Нерэагаваньне на крытыку ў друку — горшы від апортунізму на практыцы

Дырэктывы партыі і ўраду аб своячасовым рэагаваньні на допісы, зьмешчаныя ў цэнтральным і мясцовым друку, вялікі часта ігнаруюцца з боку пасобных раённых устаноў. Асабліва ігнаруюцца рабселькораўскія допісы, дасыланыя на месцы. Парт'арга нізацыям неабходна павесьці самую рашучую барацьбу за дзейсны характар рабселькораўскіх допісаў, прыцягваючы да адказнасьці асоб винаватых у нерэагаваньні на допісы. Матар'ял які сёньня зьмяшчаецца, яскрава гаворыць аб тым, што пасобныя раённыя установы апартуністычна недаацэньваюць важнасьці друку і своячасовага рэагаваньня на допісы рабселькораў. Прыкладам гэтаму могуць служыць арганізацыі Крупскага раёну КК РСІ сумесна з ЛК выяўлі, што на пасобных установах (Райкалгассаюз) допісы рабселькораў ляжалі пад сукном па 9 месяцаў, між тым, допісы своячасова на іх рэагаваць.

Рабселькораўскія допісы кладуць пад сукно

Крупкі. Рэагаваньне на допісы з боку райустаноў адсутнічае. У часе правяр'зеньня рэйду па своячасовым рэагаваньні на допісы па райустановах Крупскай райКК РСІ і ЛК выяўлена апартуністычная недаацэнка важнасьці друку і своячасовага рэагаваньня з боку асобных устаноў. Брыгадай знойдзена значная частка допісаў, на якія райустановы несвая часова рэагавалі. Райкалгассаюз на допісы не рэагаваў па 9 месяцу, 5 допісаў згублена. Амаль гэтакае становішча допісаў і па РВК, РК КП(б)Б, РайАНА, раймілыцы. Па ўсіх установах няма сталага ўліку паступаючых допісаў. З боку РВК мелася тэндэнцыя адцягваньня праверкі, адкладаньне на заўтра.

РайКК, разгледзеўшы пытаньне за марожаных рабселькораўскіх допісаў, далі канкрэтныя указаньні райустановам па рэагаваньні на допісы рабселькораў.

Брыгадзір Гэра.

Цэхпартячэйкі зав. „Камунар" ня кіруюць рабкорам

Пагледзячы на тое, што ёсьць пастанова Менгаркому КП(б)Б аб парткіраўніцтве нізавым друкам і рабкорамі, на сёньняшні дзень цэхячэйкі зав. «Камунар» ня сталі на чале выкананьня гэтай пастановы. У цэхах завода паслабілася работа нізавога друку і рабкораў. Кіраўніцтва рэдкалегіямі штодзённак з боку цэхпартячэек пастаўлена дрэнна. Пасобныя сакратары ячэек ня цікавяцца работай нізавога друку, кажучы, што ў іх ёсьць больш важная справа. Партканцэлярыя завода рашуча ня ўдарыў па тых, хто апартуністычна недаацэньвае важнасьці нізавога друку і разгортваньня бальшавіцкай крытыкі і самакрытыкі, своячасовае рэагаваньне на допісы рабкораў. Вось становішча рэагаваньня на допісы рабселькораў, як засыланыя на дасьледваньне, так і на зьмешчаныя ў друку. РайКК і ўсім партыйным, прафэсыянальным і камсамольскім арганізацыям неабходна павесьці самую рашучую барацьбу за дзейнасьць рабселькораўскіх допісаў і своячасова на іх рэагаваць.

У пасобных цэхах штодзённкі выходзяць раз у 2 месяцы. Рэагаваньне на допісы рабселькораў вельмі слабае. Шматтыражка не змагаецца на сваіх старонках за палепшаньне кіраўніцтва нізавым друкам. Сакратар ячэйкі кавальнага цэху тав. Галавач кажа — «даручана пісаць партыйцам у «газэту», але ці пішуць яны не правяраецца». Шматтыражка спадзявалася на самацёк. На заводзе ёсьць прарыў у галіне разгортваньня бальшавіцкай крытыкі і самакрытыкі.

Парткалектыў заводу «Камунар» павінен з усёй рашучасьцю ўдарыць па канкрэтных вінаватых ігнараваньня пастаноў партыі аб нізавым друку і рабселькораўскім руху. Узмацніць кіраўніцтва нізавым друкам, дамагчыся своячасовага рэагаваньня на допісы рабкораў і разгортваньня бальшавіцкай крытыкі і самакрытыкі.

Х.

Райкалгассаюз не рэагуе на допісы

УВАРАВІЧЫ. Рад допісаў, і ў раённай газэце «Калектывіст» (Уваравіцкі раён), і ў цэнтральным друку аб недахопах у пасобных калгасах раёну (імя Сталіна, «Чырвоны Кастрычнік»), у якіх панує абязьлічка па даглядзе за коньмі, не памог. Кармы скарыстоўваюцца бескантрольна і бесгаспадарча, коні стаяць амаль пад адкрытым небам, таму і маюць вельмі дрэнны выгляд.

Прыўцёленьне калгасу «Чырвоны Кастрычнік», дапушчаючы абязьлічку на стайні, патурае шкодным настроям кулацка-заможнай часткі калгасьнікаў, якія пралезьлі ў калгас і зараз шкодзяць з сяродзіны, дапускаючы псаваньне і калечаньне коней, зрываючы ўлучную кампанію. Райкалгассаюз ня прымае ніякіх захадаў.

Адпаведным органам трэба зацікавіцца становішчам калгасу «Чырвоны Кастрычнік» і Сталіна і прыцягнуць да адказнасьці вінаватых.

М. Б.

Працы сярод селькораў няма

ШКЛОЎ. У Старасельскім сельсавеце ніякай працы сярод селькораў не праводзіцца. Арганізавана брыгада селькораў, але парт'ячэйка ня ведае пра яе і ня цікавіцца ёю. Рэагаваньне на допісы селькораў адсутнічае. Сакратар Старасельскай ячэйкі тав. Шэндзюкам ігнаруе пастанову 2-га Усебеларускага зьезду аб рабоце сярод рабселькораў.

Іган.

БЕРАГ НЕ ГАТОУ да сустрэчы высокай воды

Па-баявому рыхтавацца ў першы рэйс

У красавіку і ў маі 1932 г. Гомельскі рэчны флёт павінен перавезьці каля 50 тысяч тон грузу малой хуткасьці. На сёньняшні дзень заключаны дагаворы на перавозку 35.000 тон грузаў. Гэтымі дням будзе аформлены дагавор на перавозку яшчэ 1.800 тон.

Клієнтура да навігацыі не гатова. Такія арганізацыі, як Будкантора, БЖС, Васнахарскład, Белсадгароднына, Васнітрадмаг, Дрэваапрацоўчы камбінат у Новабеліцах яшчэ не заключылі дагавораў з Гомельскай прыстанню.

Як-жа воднікі гатовы да сустрэчы навігацыі?

Да гэтага часу падрыхтоўчая работа яшчэ ня зрушылася з месца. Прыстань поўнасьцю не забясьпечана апаратам, рабочай сілай і дробным інвэнтаром для разгрузачных і напрузачных работ.

Патрэбнай рабочай сілы на прыстані поўнасьцю няма. Завербавана толькі 50 чал. сталых грузчыкаў.

Грузчыкі і сплаўскład не забясьпечаны спэцвопраткай, пасьцельнымі прыладамі.

Пабудова памяшканьня для грузчыкаў зацягваецца і невядома ці будзе скончана ў тэрмін.

Пакуль ня поздна, трэба пасьпяшацца расставіць берагавыя штаты на месцах. 68 тон вугля і 45 кубаметраў дроў, што зараз ёсьць, ня могуць забясьпечыць першы рэйс.

Бераг яшчэ недастаткова падрыхтаваны да будучай навігацыі.

На Новабеліцкай суднабудаўнічай верфі пачата будаўніцтва 9 баржаў. Будаўніцтва павінна быць скончана не пазьней 15 красавіка. На 1-га красавіка плян быў выкананы толькі на 34 проц.

На будаўніцтве назіраецца цяжучасьць рабочай сілы.

Значна затрымліваюць скончаньне суднабудаўніцтва майстэрні воднага транспарту, якія ня выконваюць заказаў — яны робяць дзьвярэй і вакон ных рам.

Наогул забясьпячэньне будаўніцтва матар'ялямі зусім дрэннае. Пакуль не пасвалася сапная дарога, праба вывезьці з лесу 100 калод і дошкі першага сорту.

Для своячасовага скончаньня судна рамонту ёсьць усе магчымасьці. Адміністрацыя верфі павінна забясьпечыць будаўніцтва патрэбным матар'ялам. Партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі верфі павінны яшчэ шырэй разгарнуць спаборніцтва і ўдарніцтва паміж брыгадамі.

Воднік.

Совецкі параход на зімоўцы

Тры фінпляны — да кожнага судна

У Гомелі адбылася нарада камандзіраў рэчнага флёту разам з трыкутнікам суднаў. На нарадзе было праведзена прымацаваньне камандаў да суднаў Гомельскай прыстані. Камандзіры і мэханікі суднаў, якія прысутнічалі на нарадзе, выказаліся за зьмяншэньне колькасьці каманды на 17 чал., што значна зьменшыць нагладныя выдаткі.

Нарада пастанавіла да 1 красавіка поўнасьцю забясьпечыць судны патрэбнай колькасьцю матросаў і качагараў. Не пазьней 26 красавіка да кожнага судна даводзіцца трансфінплян для прапрацоўкі яго на сходах камандаў суднаў да пачатку навігацыі. (Белта)

Рамонт закончыць поўнасьцю

Рамонт паравога і непаравога флёту ў асноўным скончаны. Гомельскія воднікі, высунуўшы сустрэчны плян скончэньня рамонту, выканалі ўзятыя на сябе абавязацельствы.

Перад цесьлярнай брыгадай Кандзюкова і сталярнай—Мэханікава стаяла задача — зрабіць добраякасны раомнт непаравога флёту. Іх чакалі 31 баржа і параходы Гомельскай прыстані. Расстаўленыя дугою па затоне, яны сваімі гнілымі дошкамі сыгналізавалі аб неабходнасьці рамонту.

Дэфэктныя ведамасьці, якія атрымала брыгада, дыктавалі выканаць пэўны рамонт, але, пачаўшы яго, яны спаткалі нечаканае пашырэньне аб'ёму рамонту. Дэфэктныя ведамасьці не маглі ўсё прадбачыць. У выніку там, дзе па ведамасьці на рамонт было адпушчана 2—3 чалавека-дні, прышлося выдатковаць па 12—13 чалавека-дзён.

Ні аб'ём работ, які з кожным суднам павялічваўся, ні надвор'е ня спынялі працы. Брыгада Кандзюхова пераходзіла з аднаго судна на другое, а тыя баржы; з якіх яна адыходзіла; бялелі новымі дошкамі.

Усё менш і менш заставалася перад цесьлярамі неадрамантаваных барж і нарэшце 26 лютага Кандзюхоў здаў апошні адрамантаваны дэбаркадэр. Яшчэ раней, калі фронт рамонту звужваўся, частка брыгады была перакінута на дапамогу сталярным брыгадам, якія выконвалі рамонт на паравым флёце, значыцца брыгада Кандзюхова не засталася бяз працы.

Саспаборніцтва ў брыгадах Кандзюхова і Мэханікава было не на апошнім месцы. Усе памятаюць сход воднікаў, на якім мясцком майстэрняў прэм'яваў лепшых ударнікаў: Кандзюхова, Прыходзька, Даўгадзіліна з цесьлярскай брыгады і Карпмана, Чартока і Рабінькага са сталярнай брыгады.

Зьдзельнічыла адчулася і на непаравым флёце. Гэта ўбачылі адразу рабочыя, калі пры разьліку выявілася, што прырабатак брыгад складае 80 проц.

Узяўшы на сябе абавязацельствы скончыць рамонт флёту па сталярных і цесьлярскіх работах разам з агульным рамонтам, брыгады Кандзюхова і Мэханікава выканалі іх з гонарам.

Пры праверцы выкананьня рамонту па дэфэктных ведамасьцях было выяўлена, што на некаторых параходах, ня ўвесь рамонт выкананы. Гэта абавязвае кіраўніцтва майстэрняў больш дасканала праверыць усё, што прароблена па рамонце з тым, каб ні водзін параграф рамонту не застаўся бяз выкананьня.

Выканаўцы з гонарам сваё першае абавязацельства па датэрміновым скончэньні рамонту дэталяў параходаў, завод ня мае права зараз затрымаць рамонт тых частак, якія яшчэ засталіся ня скончанымі.

Параходы ўжо гатовы. Яны чакаюць пачатку навігацыі. Адрамантаваныя ўдарнымі тэмпамі, яны таксама ўдарна павінны перавозьціць грузы.

Рол.

НА ЗДЫМКУ Будынак рэд. газэты «Известия», на Пушкінскім пляцы у Маскве.

Клієнтура не заключае дагавораў

Зімовы рамонт суднаў паравога і непаравога флёту Віцебскага дзяржаўнага параходзтва на сёньня выкананы на 95 проц. Па новым суднабудаўніцтву праграма выканана ў сярэднім на 90 проц. Нельга не паказаць на адносіны некаторых снабжаючых арганізацый да справы рамонту і будаўніцтва суднаў. Так, напрыклад, Бугінскі райпрамсаюз замест патрэбных 5-6 цалёвых цьвікоў даслаў нягодныя—10-12 цалёвыя. Рабочыя прымушаны былі замяняць цьвікі дротам.

Недапушчальна марудна праходзіць кампанія заключэньня ўмоў на перавозку з клієнтурай. Віцебскі раён павінен перавезьці ў навігацыю 1932 году 124 тысячы тон грузаў. Заявак-жа паступіла на перавозку ўсяго 100.000 тон.

Кантора Віцебскага будаўб'яднаньня, якая мае рад аб'ектаў звыш ударнага будаўніцтва, яшчэ не прыступіла да заключэньня дагавораў з параходствам і нават ня вешае аднуль давядзецца перавозіць грузы. Кантора Дзяржэнабу таксама не заключае ўмовы ў той час, калі яна павінна перавозіць вапну для патрэб будаўніцтва сэзону.

Для першага рэйсу неабходна падвезьці да прыстаняў 3.000 тан грузаў, падвезена толькі 200 тон. Віцебскі і Селезьнёўскі лесазаводы, прузаварот якіх складае 44 тысячы тон, яшчэ не пачалі падвозку матар'ялаў.

З самацёкам у падрыхтоўцы да навігацыі трэба пакончыць. Першы рэйс павінен быць скарыстаны поўнасьцю, па бальшавіцку.

Тральшчык.

Бюракраты зрываюць падрыхтоўку да навігацыі

БАБРУЙСК. (Наш кар.). Воднікі прыстані Бабруйск узялі на сябе абавязацельства скончыць рамонт флёту да 20 лютага. З выкананьнем гэтых абавязацельстваў яны цалкам справіліся. Рамонт флёту па баявому скончаны і воднікі гатовы да навігацыі. Але ў далейшым разгортваньні падрыхтоўкі да навігацыі па шляху барацьбы за шпаркае разгортваньне навігацыі ня працы, за прасьпяванае і поўнае скарыстаньне воднага транспарту прыстань сустрэлася з праявамі бюракратызму з боку раду ўстаноў і арганізацый.

Ня гледзячы на тое, што ў Бабруйску ёсьць больш дзесятку ўстаноў і арганізацый, якія будуць карыстацца водным транспартам для перавозак сваіх грузаў, толькі сплаўканторка, вучдор 2 і камгас далі свае заявкі. Астатнія мадчаць.

Бабруйскі дэрабкоп, райспажыўсаюз, саюзтранс, Белдзяржкснаб тлумачаць свае аддяжкі з падачаю заявак росныімі «аб'ектыўнымі» прычынамі. У прабленьні ЦРК нават заявілі так:

— Усімі перавозкамі распараджаецца па Менск.

ЦРК даючы такі адказ, яўна забываецца аб тым, што ён павінен праводзіць самазагатоўкі і гэтыя загатоўленыя прадукты і тавары яму ў значнай частцы прыходзіцца перавозіць водным транспартам.

Нават такое буйнае прадпрыемства дрэваапрацоўчы камбінат зусім ня думае да гэтага часу аб перавозках водным транспартам і ўпарта не дае заявкі на гэтыя перавозкі.

Такое становішча зрывае падрыхтоўку прыстані да весьнавых перавозак, да навігацыі. Энтузіязм мас воднікаў, якія датэрміновым скончэньнем рамонту даказалі сэзаю гатоўнасьць да навігацыі паралізуецца цьвёрдалобасьцю кіраўнікоў бабруйскіх устаноў і арганізацый.

Бюракраты павінны атрымаць па заслугах ад розных кіруючых арганізацый. Усе, хто злачынна зрывае своячасовую падачу заявак на водны транспарт, павінны быць прыцягнуты да адказнасьці.

А. Дамброўскі.

МТС МОГУЦЬ І ПАВІННЫ ВЫКАНАЦЬ ЛЁНАЗАГАТОУКІ

Крутая гнаць увер крывую лёназагатовак

На 25 сакавіка МТС выканалі 72,4 проц. пляну

Перавыканалі пляны:

1. Гарадоцкая МТС	152 проц.
2. Лёзьненская »	114,4 »

Набліжаюцца да завяршэньня:

1. Касьцюковіцкая	97,5 проц.
2. Дрысенская	88,8 »
3. Баркавіцкая	87,6 »
4. Сіроцінская	82,1 »
5. Мсьціслаўская	81,0 »
6 Шклоўская	79,0 »

Адстаюць:

1. Клімавіцкая	76,5 проц
2. Сеньненская	73,1 »
3 Ветрынская	72,8 »
4. Заслаўская	71,5 »
5 Старадарожская	70,0 »
6 Жыткавіцкая	69,0 »
7. Слуцкая	68,0 »
8. Лепельская	67,7 »
9. Дубровенская	67,4 »
10. Вушацкая	66,6 »
11. Аршанская	60,6 »

Зрываюць лёназагатоўкі:

1 Церахаўская МТС.	59,6 проц.
2 Расонская »	59,4 »
3. Капыльская »	57,5 »
4. Т ческая »	53,7 »
5. Рагачоўская »	48,0 »
6 Горацкая »	46,9 »
7 Магілеўская МТС	42,0 проц.
8 Смалявіцкая »	36,5 »
9 Асьвейская »	35,6 »
10 Койданаўская »	20,2 »
11 Менская »	20,0 »

Ісьці ў нагу з Лёзьненскай МТС

ЛЁЗНА. Лёзьненская МТС выканала імян лёназагатовак на 14,4 проц. Калгасы, якія абслугоўваюцца па лініі МТС, здалі (прадалі) дзяржаве добраякаснае лёнавалакно, закончыўшы апрацоўку яго ў вызначаныя тэрміны.

Чым тлумачацца посьпехі МТС, якая дамагчася перавыкананьня пляну лёназагатовак? Асноўнае—гэта правільнае, бальшавіцкае кіраўніцтва з боку райкому КП(б)Б, правільная арганізацыя работы, чоткая апэрацыйнасьць.

МТС, не чакаючы пакуль трасту забяруць на лёназавод, арганізавала ручную апрацоўку лёну. Для гэтай мэты былі выкарыстаны лёнамялкі як МТС, так і калгасаў. Лёнасушыльныя пункты і лёнамялкі працавалі кругласутакі.

Для апрацоўкі лёну ва ўсіх калгасах МТС былі арганізаваны сталыя брыгады. У парадку сацспаборніцтва брыгады перавыкавалі нормы выпрацоўкі.

Ня было ніякага фарсіраваньня паміж мяцьцём, трапаньнем і здачай таварнай прадукцыі. Паміж мяцьцём і здачай лёнавалакна МТС дамагліся та мінімуму ўшчыльненьня тэрмінаў. Гэты бесперапынны кантэр забясьпечыў своячасовую здачу лёнавалакна.

Немалаважную ролю ў справе перавыкананьня пляну адыграла тое, што парт'ячэйкі, МТС і сельсаветы далі рашучы адпор кулацкай уражлівасьці і спажывецкім настроям, што мае месца ў радзе іншых калгасаў. Уся таварная прадукцыя поўнасьцю здавалася. Адзінкавым спробам «пакідаць лён на лапці», на вяроўкі і інш., давалі рашучы адпор.

Вось тыя мэтады работы, якіяючы якім Лёзьненская МТС дамагчася перамогі. Гэта з усёй яскравасьцю сьцьвердзіла тое, што там, дзе парт'арганізацыі зварочваюць належную ўвагу на лёнаапрацоўкі—там забясьпечана поўная перамога.

К-у.

Фарсаваць апрацоўку трасты

Рад МТС злачынна ігнаруюць дырэктыву партыі і ўраду аб паскарэньні апрацоўкі трасты. Таксама нічога ня робіцца па арганізацыі расьціку лёнасаломкі па насьце.

Так напрыклад, па калгасах Мсьціслаўскай МТС ёсьць 54 тоны лёнасаломкі, але дырэкцыя і спэцыялісты МТС ня прымаюць ніякіх мер, каб арганізаваць зімовы расьціл саломкі. На агул МТС нядбайна адносіцца да апрацоўкі тэхкультур. У калгасах да апошняга часу ляжыць 503 тоны канапляной трасты, да апрацоўкі якой ніхто ня прыступае. Лёнамялкі поўнасьцю не натружаны, ня створаны сталыя брыгады па апрацоўцы лёну і канапель.

Ня лепш абстаіць справа і па калгасах Сіроцінскай МТС, дзе ляжыць неапрацаванай 150 тон трасты. Калгасы Сеньненскай МТС зусім спынілі апрацоўку лёну, ня гледзячы на тое, што ў іх ёсьць 46 тон неапрацаванай трасты.

Шклоўская МТС яўна ігнаруе ручную апрацоўку лёну. Дырэкцыя МТС усё чакае, што трасту можна будзе здаць на Шклоўскі лёназавод, і ў сувязі з гэтым спыніла апрацоўку лёну.

Па калгасах гэтай-жа МТС таксама нічога ня робіцца, каб закончыць расьціл саломкі па насьце, ня гледзячы на тое, што Тракгараданэр даў рашучую дырэктыву як мага хутчэй закончыць расьціл.

Кіруючыя раённыя арганізацыі павінны забясьпечыць круты пералом у лёназагатоўках па калгасах, перапрацоўных МТС. Неабходна зараз-жа арганізаваць ручную апрацоўку лёнатрасты і лёнаканапі.

Б.

Апрацаваць і здаць усю продукцыю

Расьціл лёнасаломкі выключна ў пэрыяд восені па травяным пласту не заўсёды дае станоўныя вынікі. Мэтэаралёгічныя ўмовы не заўсёды спрыяюць выхаду добраякаснай прадукцыі. Апрача таго, позьнія пасевы лёну зусім не ўдаецца разаслаць. У выніку ўсіх гэтых акалічнасьцяй амаль 20 проц. ураджаю застаецца ляжаць мертвым капіталам.

Між тым можна значна паскорыць апрацоўку лёну, арганізаваўшы зімовы расьціл лёнасаломкі, па так званай насьце. Зімовы расьціл лёну, які ўжываўся на Урале і ў Заходняй вобласьці; даў добрыя вынікі. вагакно атрымалася высокіх нумароў, да 18, са сьветлым колерам.

Лепшым часам для зімовага расьціл ду трэба лічыць сьнежань — сакавік. У БССР таксама арганізаваны расьціл лёну па насьце. МТС маюць разасланай да 1.500 тон ільнянай саломкі. Аднак, ня гледзячы на рашучыя паказаньні ЦК КП(б)Б аб паскарэньні лёназагатовак, а таксама і тое, што хутка нельга будзе праводзіць расьціл па насьце, рад МТС нядбайна адносяцца да гэтай важнейшай задачы. Калгасы, якія абслугоўваюцца па лініі МТС, ледзь разаслалі каля 300 тон лёнасаломкі. Па калгасах Шклоўскай і Сіроцінскай МТС вялікая колькасьць лёнасаломкі ляжыць па калгасных гумнах, але ні кіраўніцтва, ні спэцыялісты МСТ, ні прадпрыемствы ні калгасаў ня прымаюць рашучых мер, каб арганізаваць расьціл.

Трэба рашуча ўзяцца за арганізацыю расьціл лёнасаломкі. Апартуністы, якія недаацэньваюць зімовы расьціл саломкі; павінны атрымаць рашучы адпор. У калгасах павінны быць неадкладна арганізаваны сталыя брыгады для арганізацыі расьціл лёнасаломкі па насьце.

Будай.

Вопыт школьнай работы, які трэба шырока распаўсюдзіць

У сваёй гістарычнай пастанове аб пачатковай і сярэдняй школе ад 5 верасьня ЦК канстатуе, што «карэнны недахоп школы ў даны момант заключаецца ў тым, што навучаньне ў школе не дае дастатковага аб'ёму агульна-асьветных ведаў».

Не малую ролю ў гэтых адносінах адыграў комплекс. Часта пад відам комплексу падносілі дзецям павярхоўныя, расплыўчатыя веды. Некаторым дысцыплінам аддавалася мала ўвагі. Бывалі выпадкі, калі пасобныя прадметы зусім не праходзіліся з тае прычыны, што настаўнік быў слаба падрыхтаваны, або захапляўся якім-небудзь адным прадметам.

Пастанова ЦК абавязвае ўсю пралетарскую грамадзкасьць, у першую чаргу настаўніцтва, рашуча змагацца з такімі адносінамі да атульна-асьветных ведаў, абавязвае даць асновы навук па ўсіх дысцыплінах, «забясьпечыўшы дакладна-акрэсьленае кола сыстэматычных ведаў».

Але трэба адзначыць, што змаганьне за сыстэматычныя веды і фармальныя навыкі не зьяўляецца зваротам да старой славеснай, схаластычнай школы, як гэта зразумела некаторая частка настаўніцтва, якая гаворыць: «комплекс адменены, зараз трэба клапаціцца толькі аб фармальных навыках».

А фармальныя навыкі часам даюцца так: «дзеці ўстаюць па чарзе, чытаюць з кнігі з гадзіну, а потым амаль дослоўна, фальцэтам, у адзін дух, пераказваюць прачытанае. І так адзін за адным усю лекцыю. Задача разьвязваецца ў клясе (з арт. Агранэўскага, «Правда» за 28-II). Гэта ня мэтады савецкай школы так даваць навыкі дзецям—гэта значыць не разумець задач савецкай палітэхнічнай школы.

Мы павінны даць дзецям «дакладна акрэсьленае кола сыстэматызаваных ведаў». Нам неабходна дабівацца, каб гэтыя сыстэматызаваныя веды засвайваліся вучнямі сьвядома, а не мэханічна.

«На месца старой вучобы, старой зубрэўкі, старой муштры мы павінны паставіць уменьне ўзяць сабе ўсю суму чалавечых ведаў, і ўзяць так, каб камунізм ня быў-бы ў нас нечым такім, што завучана, а быў-бы тым, што намі самімі прадумана, быў-бы тымвыводамі, якія зьяўляюцца намінучымі з пункту гледжаньня сучаснай адукацыі» (Ленін).

Мы павінны забясьпечыць цесную сувязь тэорыі з практыкай, узброіць вучняў уменьнем ужываць свае веды на практыцы і на падставе тэарэтычных ведаў асмысьліць практыку. Трэба абавязкова ўтварыць стымул і зацікаўленасьць да ведаў. Пры гэтым трэба цьвёрда памятаць, што ўся работа рабят падпарадкавацца вучэбна-выхаваўчым мэтам школы і не перашкаджае сыстэматычнасьці курсу. Спосабы, якімі можна ўсяго гэтага дабіцца, вельмі разнастайныя.

У гэтым артыкуле мы маем на ўвазе падзяліцца невялікім вопытам работы па мове ў гэтым напрамку.

3-я група 27-й школы (у Менску) ў пачатку навучальнага году прыняла шэфства над «0» групай гэтай-жа школы. Вучні 3-й групы дапамагаюць там адсталым вучням, рыхтуюць для іх розны дыдактычны матар'ял, гуляюць у часе перапынку з нулявікамі і г. д. Сувязь наладжана добрая і гэта карысна і для «0» і для 3 гр. (аб гэтым у другі раз). Вось я і вырашыла для замацаваньня і практычнага ўжываньня дзіцячых ведаў па мове скарыстаць гэтую сувязь з нулявой групай.

На лекцыях па мове, каб з аднаго боку ажывіць заняткі, а з другога надаць сэнс і мэтанакіраванасьць некаторым відам работы (умець расказваць, самім скласьці апавяданьне, выступаць з галосным выразным чытаньнем, напісаць заметку і г. д.), было вучням 3-й групы прапанавана складзіць раніпнік для дзяцей «0» гр. Вучням гэта прапанова вельмі спадабалася. Брыгады (на лекцыі разьвіцьця пісьмовай мовы) склалі праграму раніпніка. Была дана ўстаноўка, што трэба выбраць для праграмы такі матар'ял, які быў-бы даступны і цікавы для малых.

Што-ж мы ўзялі для праграмы гэтага раніпніку?

Калі вучні расказвалі (на лекцыях разьвіцьця вуснай мовы) пра зьмест кніжак, якія яны бяруць з бібліятэкі, мы рашылі некалькі апавяданьняў больш лёгкіх і цікавых расказаць малым. Для гэтага трэба было добра падрыхтавацца. Тут ужо пачынаецца сацспаборніцтва паміж брыгадамі: які брыгада выбярэ больш адпаведны матар'ял, даступны дзецям гэтага ўзросту і апроч гэтага лепш раскажа.

Потым рашылі, што трэба ня толькі расказаць, але і прачытаць што-небудзь. Зноў работа цікавая—трэба выбраць апавяданьні, падрыхтаваць, каб прачытаць добра, выразна, галосна і каб усе зразумелі вершаў 5) маленькая драматызацыя, 6) даклад дзяцей аб рабоце ў майстэрнях, што яны там зрабілі для нулявікоў, на што патрэбны гэтыя зробленыя рэчы, колькі часу гэта работа заняла ў вучняў 3 групы, як была арганізавана гэта работа ў майстэрнях і г. д.

На лекцыях па мове ў дзяцей была работа (шмат раней) зьбіраць загадкі. Работы з рашылі—выбіраць загадкі цікавыя, лёгкія і запытаем у нулявікоў, каб яны адгадвалі. А калі малыя ня змогуць адгадаць, трэба будзе ім растлумачыць.

Такім чынам атрымалася такая праграма раніпніку: 1) апавяданьні, 2) чытаньне, 3) загадкі, 4) дэклямацыя вершаў 5) маленькая драматызацыя, 6) даклад дзяцей аб рабоце ў майстэрнях, што яны там зрабілі для нулявікоў, на што патрэбны гэтыя зробленыя рэчы, колькі часу гэта работа заняла ў вучняў 3 групы, як была арганізавана гэта работа ў майстэрнях і г. д.

Парашылі закончыць раніпнік гульнёй так: расказаць зьмест гэтай гульні, каб малышы зразумелі яе сутнасьць, а потым арганізаваць і правесьці гэтую гульню. Некаторыя матар'ялы дзеці самастойна распрацавалі брыгадамі па-за школай. Дамовіліся, каб на самым раніпніку сачыць за тым, што было добра, што было кепска, што малышам падабалася і што было ім ня цікава. Аб гэтым зрабіць потым даклад у клясе і акрамя таго напісаць артыкул у насьценгазэту.

Дзеці такой работай вельмі зацікаўлены. Яны адчуваюць, што свае веды яны могуць ужыць на практыцы, зрабіўшы пры гэтым грамадзка-карысную працу.

У нашай штодзённай рабоце мы часта замячаем, што кантрольныя пытаньні, паўтарэньні прыядаюцца дзецям (чаму яшчэ раз расказаць, прачытаць—пытаюцца дзеці). Пры такой-жа рабоце, як апісана вышэй, такія пытаньні ня ўзьнікаюць, а наадварот—работа добраахвотна ў парадку сацспаборніцтва імкнуцца добра падрыхтавацца і паўтарэнуць усё многа разоў.

Зразумелая рэч, што гэта толькі адзін з прыкладаў скарыстаньня грамадзка - карыснай работы ў мэтах замацаваньня ведаў па мове. Мажліва і патрэбна ўжываць розныя іншыя работы: выступленьні перад бацькамі, арганізацыя выстаўкі (паказ сваіх дасягненьняў), выступленьні на школьных сьвятах, чытаньне дома малышам і г. д. і г. д. Але пры ўсіх відах работы трэба памятаваць, што грамадзкая карысная праца павінна падпарадкавацца вучэбнай праграме, развіваць дзяцей, пашыраць яго амругавід, замацоўваць яго веды, навучыць самастойна працаваць.

Фаня Гольмштон.

За буйны яблычны камбінат

(У парадку пастаноўкі пытаньня)

Харчовая прамысловасьць разьвіваецца ў БССР вялікарнымі крокамі. У Гомалі, Бабруйску, Воршы і іншых гарадох БССР ёсьць заводы і фабрыкі, якія выпускаюць цукерачныя і мармаладныя вырабы, галоўным чынам з яблык. Рэсурсы БССР поўнасьцю дазваляюць гэту справу значна пашырыць. Штогод у нас гінуць сотні тон яблык. Антонаўка зьяўляецца адным з галоўных відаў яблык у БССР. Паводле думкі прафэсара Горацкай с. г. акадэміі Туркыня, антонаўка ў нас ня поўнасьцю ўтылізуецца, вялікая частка гніе, прападае ў садох.

Беларуская «антонаўка» больш ніжкіх гатункаў: падаліна, недасьпелыя яблыкі могуць быць скарыстаны самым радыкальным чынам. З іх можна было-б выраблядь яблычны сок, яблычнае цеста, пэктын і інш. віды вельмі каштоўнай прадукцыі ня толькі для ўнутранага рынку, але і для экспарту.

У БССР яблычны сок выробляе адзін толькі завод у Воршы «Спартак», што знаходзіцца ў веданьні Белбродаб'яднаньня. Гэты завод галоўным чынам выробляе віно, а сок «між іншым».

Летась на гэтым заводзе была камісія з Масквы, устанавіла, што завод «Спартак» выробіў «між іншым» некалькі тон высокакаснага яблычнага соку, які мог быць поўнасьцю экспартаваны.

Трэба падкрасьліць, што яшчэ ў 1929 г. Белдзяржканцлем было ўзьнята пытаньне аб пабудове камбінату па выробе соку, канцэнтратаў, галоннага яблыка і пэктыну і ўтылізацыі ўсіх адыходаў. Думка гэта вельмі абаранялася прафэсарам Туркыем. Але справе ходу не давалі і думка заглохла.

Цяпер некаторыя зацікаўленыя арганізацыі зноў узьнялі гэтае пытаньне перад адпаведнымі дырэктыўнымі арганамі і паставілі яго ў досыць рашучай форме.

Для паказанага камбінату на першы час патрэбна будзе каля 10.000 тон яблык другіх і трэціх гатункаў, і апроч таго, недасьпелых яблык.

Сыравінныя рэсурсы гавораць за тое, што 10.000 тон яблык зусім жыцьцёвая і рэальная лічба. Валавая прадукцыя ўраджаю апошніх двух год дасягае ў сярэднім 115.000 тон разам з падаліцай (арыентовачна). Плошча садовых насаджэньняў павінна быць ў 1933 г. значна павялічана, а таму непакой, што для камбінату ня хопіць сыравіны ні чым ня ўпрэтэзаны.

Няма сумненьня, што будаўніцтва такога спэцыяльнага камбінату ў БССР высока ўзьніме нашу харчовую прамысловасьць, і такія прадукты як пэктын (пэктын атрымліваецца пасьля адціскаваньня соку з яблык, т. зв. мокры морс сушыцца, пасьля чаго з мешаніны атрымліваецца вельмі каштоўны прадукт для цукерачнай прамысловасьці —пэктын), галонныя яблыкі, сок і інш. адыграюць не малую ролю ў абагачаньні нашай прамысловасьці — пэктын), галонныя яблыкі, каб ў 1933 годзе завод мог быць пушчаны ў ход.

А дзе-ж будаваць гэты камбінат? Гэта пытаньне глыбока займае спэцыялістаў БССР. Некаторыя паказваюць на Магілеўскі раён, да якога прыляжаюць буйныя яблычныя масывы, іншыя прапануюць Жлобін, як буйны вузлавы пункт і абружаны з усіх бакоў таксама вялікімі садамі. Есьць думка, што камбінат павінен быць на будаваны ў раёне, блізка да садоў: Уваравічы, Веткі і г. д.

Мы не палаем асаблівага значэньня МЕСЦУ ПАБУДОВЫ.

Справа ў тым, што тая колькасьць яблык, якая спатрэбіцца для нагрузкі камбінату, будзе дастаўлена, дзе-б камбінат не стаяў. Зразумела, неабходна прыняць пад увагу ніякі зпосіб, пранспорт, як водны, так і чыгунны. яблычны камбінат павінен быць па будаваны.

Л. Манін.

Правяраем выкананьне сацдагавору асьветнікаў БССР з Заходняй вобласьцю

Кожны асьветнік павінен быць

актыўным удзельнікам пасеўнай

За што эмагаюцца асьветнікі?

Асноўнай задачай партыйных, сазетскіх і прафсаюзных арганізацый у весняной пасеўнай кампаніі зьяўляецца барацьба за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, высокую ўраджайнасьць, аўладаньне агратэхнікай, шчыхільную рэалізацыю шасьці ўмоў т. Сталіна.

Пасьпяховае выкананьне пляну трэцяй бальшавіцкай вясны патрабуе актыўнага ўдзелу ў ёй прафсаюзных органаў працасьветы і ўсёй масы асьветнікаў. У мэтах баявога выкананьня задач пасеўнай кампаніі асьветнікі Савецкай Беларусі заключылі сацдагавор з асьветнікамі Заходняй вобласьці.

За што-ж будуць змагацца і змагаюцца асьветнікі БССР.

Асьветнікі ўзялі на сябе абавязацельства прыняць актыўны ўдзел у правядзеньні сталінскай культэстафэты веснавой сяўбы па трох маршрутах арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, агратэхнічная прапаганда і культбытавая работа.

Правядзеньне культэстафэты павінна быць увязана з грамадзка-карысной працай школ на аснове падпарадкаваньня яе вучэбна-выхаваўчым мэтам школы.

У кожным раёне ў час падрыхтоўкі да сяўбы асьветнікі абавязаліся нала дзіць паказальнае культабслугоўваньне аднаго калгасу, саўгасу або МТС. Абавязаліся асьветнікі прыняць актыўны ўдзел у арганізацыі вытворчых брыгад у калгасах, саўгасах і МТС, усю сетку палітасьветустаноў уключыць у падрыхтоўку і правядзеньне веснавой сяўбы.

Пытаньне падрыхтоўкі кадраў, укараненьне агразоатэхнікі ў шырокія калгасныя і бядняцка-серадняцкія масы—адна з ўмоў пасьпяховага выкананьня задач, пастаўленых партыяй і урадам у правядзеньні трэцяй бальшавіцкай вясны.

Па сацдагаворы з асьветнікамі Заходняй вобласьці асьветнікі БССР абавязаліся ў кожным раёне забясьпечыць выкладчыкамі ў парадку прамалазкай работы абслугоўваньне кароткатэрміновых курсаў па падрыхтоўцы масавых прафэсій, арганізаваць па ўсёй БССР 700 агратэхнічных гурткоў. Апрача таго, асьветнікі сумесна з органамі нарасьветы абавязаліся арганізаваць курсы па падрыхтоўцы дашкольных работнікаў, праз гэтыя курсы падрыхтаваць 7.300 чал., галоўным чынам для дзіцячых пляцовак у калгасах і саўгасах. Узяліся асьветнікі сабраць 15.000 руб. на набыцьцё акцый Трактарацэнтру і правесьці работу па засеву калгасамі, саўгасамі і бядняцка-серадняцкімі гаспадаркамі 2.000 культэктараў.

Арбітрам па праверцы выкананьня сацдагавораў абраны газэты «Савецкая Беларусь», «ЗКП» і «Рабочий Путь».

НА ПЕРАДАВЫХ ПАЗІЦЫЯХ

Весткі з месц сьведчаць аб тым, што асьветнікі БССР актыўна ўключыліся ў падрыхтоўку да пасеўнай кампаніі. Уся работа праходзіць пад кутом погляду лепшага выкананьня сацдагавору з асьветнікамі Заходняй вобласьці. Раённыя арганізацыі саюзу працасьветы ў разьвіцьцё гэтага сацдагавору выклікаюцца на сацспаборніцтва асобныя раёны Заходняй вобласьці. Так, асьветнікі Вузьдзенскага раёну выклікалі на сацспаборніцтва на лепшы ўдзел у пасеўнай кампаніі асьветнікаў Жыраўнінскага раёну Заходняй вобласьці. Усе асьветнікі Вузьдзенскага раёну прымацаваны да калгасаў, дзе праводзяць работу па дадзеньні пляну сяўбы да кожнага калгасу, па арганізацыі вытворчых брыгад, па засыпцы насеньня і страхавых фондаў.

У Жыткавіцкім раёне пры дапамозе асьветнікаў планы сяўбы распрацаваны на сходах калгасьнікаў і аднаасобнікаў-беднякоў і сераднякоў. Настаўнікі раёну праводзяць вялікую работу па ліквідацыі абязьлічкі ў калгасах, дапамагаюць рэгулярна выдаваць насьценгазэты ў калгасах.

Ажыцьцяўленьне сацдагавору з асьветнікамі Заходняй вобласьці, ЦП працасьветы дало адпаведныя сырэк тывы мясцом. Вылучаны пункты, дзе павінна быць наладжана культабслугоўваньне. Так, Менскаму гаркому працасьветы даручана наладзіць паказальнае культабслугоўваньне ў Менскай і Койданаўскай МТС, Капыльскаму і Слуцкаму райкомам асьветнікаў даручана паказальна абслужыць свае МТС. На ўсіх іншых раёнах мясцовыя прафарганізацыі па сваім выбары павінны наладзіць паказальнае культабслугоўваньне у адным з калгасаў або саўгасах раёну.

Сыс.

Падцягнуць адстаючыя вучасткі

За час пасьля заключэньня сацдагавору з асьветнікамі Заходняй вобласьці на лепшы ўдзел у падрыхтоўцы і правядзеньні веснавой пасеўнай кампаніі—на прэзыдыуме ЦП саюзу працасьветы у парадку праверкі былі заслуханы справаздачы 7 раённых арганізацый асьветнікаў.

З справаздачы відаць, што на мясцох разгорнута досыць вялікая работа па падрыхтоўцы да пасеўнай кампаніі. Пытаньне ўдзелу асьветнікаў у трэцяй бальшавіцкай вясне было прапрацавана на пашыраных паседжаньнях гайкомаў саюзаў, на сходах прафактыву.

Асьветнікі дапамагаюць калгасам складаць вытворчыя пляны, удзельнічаюць у праверцы і ачысцы насеньных фондаў, дапамагаюць праводзіць улік рабочай сілы і працы калгасьнікаў, разьбіваюць калгасьнікаў на брыгады.

На ВІЦЕБШЧЫНЕ, ГОМЕЛЬШЧЫНЕ, МЕНШЧЫНЕ, АРШАНШЧЫНЕ і цэлым радзе іншых раёнаў асьветнікі ўзяліся за наладжваньне паказальнага культабслугоўваньня калгасаў і саўгасаў. Асьветнікі РАГАЧЭЎСКАГА, ЛАГОЙСКАГА, КЛІМАВІЦКАГА, СТАРОБІНСКАГА і ЛЕПЕЛЬСКАГА раёнаў уключыліся у правядзеньне конкурсу нізавога друку, колькасьць насьценгазэт у калгасах павялічваецца. У РАГАЧЭЎШЧЫНЕ пры ўдзеле асьветнікаў па некаторых калгасах пачалі выдавацца штодзённыя насьценгазэты.

Пры некаторых сельсаветах Рагачэўскага раёну асьветнікамі арганізаваны курсы калгасьнікаў—брыгадзіраў. Гэтыя курсы абслугоўваюцца настаўнікамі ў парадку грамадзкай нагрузкі.

У ДУБРОВЕНСКІМ раёне па некаторых сельсаветах пры ўдзеле асьветнікаў арганізаваны дазоры падвышэньня ўраджаю. Гэтыя дазоры зьяўляюцца аднэй з лепшых форм мабілізацыі шырокіх мас калгасьнікаў на аўладаньне агра-тэхнікай і ўжываньне апошняй у вытворчасьці, на выкананьне пляну падрыхтоўкі да сяўбы.

З БУДАКАШАЛЕЎСКАГА, ПАРЫЦКАГА, КОЙДАНАЎСКАГА і раду іншых раёнаў паведамляюць, што асьветнікі і школы праводзяць вялікую работу па збору попелу, наладжваньні гутарак на тэмы пасеўнай кампаніі з калгасьнікамі і бядняцка-серадняцкім сялянствам.

Але ня ўсе яшчэ культасьветныя установы і асьветніцкія масы ўключыліся ў баявую падрыхтоўку да сяўбы. З раду раёнаў ідуць весткі аб тым, што наасобныя дамы культуры ў яшчэ на замку. Слаба ўвязваецца работа па падрыхтоўцы да сяўбы з барацьбой за рэалізацыю пастановы ЦК партыі аб школе, з праверкай выкананьня дагавораў школ з калгасамі па політэхнізацыі. У АРШАНСКІМ, СМАЛЯВІЦКІМ, ЛОЕЎСКІМ і КЛІМАВІЦКІМ раёнах асьветніцкія масы яшчэ слаба ўключыліся ў практычную дапамогу па рэалізацыі цэнтральнай задачы—арганізацыйна гаспадарчым умацаваньні калгасаў.

ВІЦЕБСКІ райком працасьветы фармальна ўключыўся ў конкурс, аб вешчаны «Правдой»—ня прыняў канкрэтных мер для рэалізацыі ўзятых на сябе канфэрэнцыяй асьветнікаў абавязацельстваў.

Усе недахопы ў разгортваньні работы па падрыхтоўцы да пасеўнай кампаніі павінны быць неадкладна зьнішчаны. Раённыя прафарганізацыі працасьветы ўсю работу павінны перавесьці на рэйкі сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

В—скі.

Сустрэць паводку падрыхтаванымі

Улічыць вурокі паводкі 1931 году

Вялікія страты панесла прамысловасьць, гарадзкая гаспадарка, паасобныя жыхары—ўся народная гаспадарка Беларусі—ў мінулым годзе ад паводкі выключна з прычыны нашай непадрыхтаванасьці, з прычыны ня ўліку адзнак набліжэньня паводкі.

Сёлета вурокі мінулага мы павінны цалкам улічыць і скарыстаць.

Зімовыя ападкі бягучага году былі некалькі меншыя, чым у 1930-31 г., але гэта не дае магчымасьці думаць, што мы забясьпечаны ад пагрозы паводкі. У выніку дажджлівай восені і марозаў, якія надыйшлі раней, чым зямля пакрылася сьнегам, вільготная і моцна зьмерзлая глеба, пры таяньні сьнегу ня зможа ўзабраць у сябе значнай колькасьці вады. Большая колькасьць вады пойдзе ў рэкі, што павядзе за сабой высокі ўздым вады і, значыцца, выкліча пагрозу паводкі.

У сярэднім узровень вады будзе ў бягучым годзе толькі каля 1 мтр. ніжэй чым у мінулым годзе, а калі сьнег будзе раставаць хутка, то ў паасобных мясцох Беларусі магчыма чакаць паводкі аднолькавай з мінулай.

Урад БССР, улічваючы небясьпеку новай паводкі, ужо прыняў адпаведныя меры. Пры СНК створана тройка па барацьбе з паводкай і веснавым лёдаходам, якая па старшынством тав. Домарава, прыступіла да работы.

Сваім загадам № 1 ад 18 сакавіка тройка дае зусім канкрэтныя паказаньні аб мерапрыемствах па падрыхтоўцы да барацьбы з паводкай.

У Менску, Вітебску, Гомлі, Магілеве, Бабруйску ў абавязковым парадку ствараюцца тройкі, таксама як і пры гарсаветах, РВК і сельсаветах на мясцох, у якіх пагроза паводкі больш рэальная.

Тройкі непасрэдна адказваюць да сваячасовасьці і дзейнасьці мерапрыемстваў, накіраваных супроць небясьпекі паводкі.

Праз спэцыяльныя тэхнічныя камісіі тройкі павінны абсьледваць усе прадпрыемствы, транспартныя пабудовы (чыгункі, масты, шошы...), калгасы, саўгасы, якія знаходзяцца ў пагражаючых мясцох, і прапрацаваць мерапрыемствы для выратаваньня маёмасьці, стварэньня загародаў для вады, па забясьпечаньні харчаваньнем, палівам і сьвятлом жыхароў і інш.

Тройкі загадзя павінны распрацаваць пляны мабілізацыі насельніцтва і цягавай сілы на барацьбу з паводкай і выдаць у гэтым напрамку абавязковыя пастановы.

Гарадзкія і раённыя тройкі ў сельсаветах, на прадпрыемствах, у паасобных калгасах і саўгасах, якім не пасрэдна пагражае паводка, павінны таксама стварыць тройкі па барацьбе з ёю.

Яны абавязаны загадзя да кожнага пагражаемага аб'екту прымацаваць адказных таварышоў, устанавіць на іх дзяжурствы, згрупаваць у небясьпечных мясцох сродкі барацьбы з лёдаходам, стварыўшы ў выпадку неабходнасьці загатоўку новых плытоў, лодак і інш., устанавіць ахову небясьпечных месц, усклаўшы арганізацыю яе на міліцыю.

Зараз-жа павінна быць устаноўлена колькасьць насельніцтва, якое падлягае высяленьню ў часе паводкі, і вызначаны месцы для яго часовага прытулку.

Органы НКСнабу і каапэрацыі абавязаны загадзя паклапаціцца аб арганізацыі для пацярпеўшых грамадзкага харчаваньня, забясьпечыць насельніцтва прадуктамі, палівам, газай і інш.

Органы НК Аховы здароўя абавязаны прадугледзець арганізацыю ў адпаведных мясцох медычнай дапамогі.

Тройка пры СНК абавязала мэтэаралёгічны інстытут за 5 дзён наперад апавяшчаць у газэце «Савецкая Беларусь» мяркуемыя зьмены надворя. Паводле загаду тройкі, у НКСнабе, у наркамаце Камгасу, у НК Аховы Здароўя і ў Галоўдартрансе ўжо з 20-III устанаўляюцца дзяжурствы адказных працаўнікоў. Пры галоўным кіраўніцтве РС міліцыі БССР (тэл. № 13) устаноўлена дзяжурства членаў тройкі пры СНК.

М. Х.

Стыхіі проціпаставіць сацыялістычную арганізаванасьць

Страты, які панесла народная гаспадарка БССР ад лёдаходу і паводкі ў 1931 годзе, роўны прыблізна 3 млн. рублёў. Тры мільёны рублёў, неабходных у выкананьні пляну пяцігодкі, былі змыты вадой з прычыны нашай непадрыхтаванасьці, з прычыны таго, што свайчасова мы ня прынялі належных мер супроць паводкі, супроць лёдаходу.

Каб ухіліцца страт, якім пагражае стыхія трэба проціпаставіць гэтай стыхіі нашу сацыялістычную арганізаванасьць і плянавасьць.

Трэба загадзя правесьці падрыхтоўчыя работы да пропуску лёду і для спуску вады на нашых вадазборах. Галоўным чынам гэта неабходна зрабіць у найбольш небясьпечных мясцох—каля мастоў і падыходаў да іх. Як РВК, таксама і раённыя грамадзкія арганізацыі, абавязаны зьвярнуць асаблівую ўвагу на падрыхтоўку мастоў да лёдаходаў і паводкі.

Канкрэтна ў асноўным мерапрыемствы зводзяцца да наступнага:

1. Расчыстка ледзяных палёў каля мастоў прыблізна на 100 мтр. вышэй маста і на 50—60 мтр. ніжэй.

2. Падрыхтоўка грузаў (каменьне і інш.) для загрузкі мастоў, каб іх ня зьнесла вадой. Для гэтай-жа мэты—загатоўка якароў і канатаў ці тросаў. Загрузку мастоў трэба рабіць у тых выпадках, калі вада падыходзіць да нізу прагонаў, або калі палі маста ў минулыя гады былі падмыты паводкай.

3. Загатоўка належнай колькасьці лодак, канатаў, ломаў, крукоў, ліхтароў і інш.—ўсё што патрэбна для пропуску лёду, аховы маста, выратаваньня пацярпеўшых.

4. Загатоўка фашыньніка, фашыньных матрацаў, рагожных кулёў, мяхоў, у якія насыпаць пясок ці зямлю для ўзмацненьня маставых дамбаў, для укладкі размытых месц.

5. Прымацаваньне да кожнага маста адказнага за ўсю справу таварыша, людзей і коняй для работы, дзяжурных, арганізацыя мэддапамогі.

6. Арганізацыя сталай сувязі з тройкамі па барацьбе за паводкай пры РВК і гарсаветах і са штабам пры Галоўдартрансе (Менск, і дастаўкі ў штаб рэгулярных вестак аб ходзе лёдаходу і паводкі.

У тым выпадку, калі паводка зносіць мост неабходна памятаць, што зьнесены мост трэба злавіць і замацаваць канатамі і якарамі, каб, з аднаго боку, мост ня згінуў, а з другога—каб ён не разбурыў мастоў што ляжаць ніжэй.

Калі гэтыя галоўнейшыя мерапрыемствы будуць выкананы, тады будзе магчыма ўхіліцца вялікіх страт і ўхіліцца непрадукцыйнага выдаткаваньня грошай, якія неабходны для выкананьня пляну будаўніцтва сацыялізму.

Кобызеў.

За „работу" Старасельскага дому культуры адказвае мясцовая партячэйка

Дом культуры ў Старасельскім сельсавеце (Шклоўшчына) не заняў належнага месца ў гаспадарча-культурным будаўніцтве. Ён большай часткай на замку. Загадчык дому культуры тав. Шур работай не цікавіцца і не ўмяжае культасьветнай работы з правядзеньнем гаспадарча - палітычных кампаній на вёсцы.

Бібліятэка дому культуры засьмечана нацыянал-дэмакратычным хламам. Новай літаратуры ня выпісваецца, бо старшыня сельсавету тав. Калюўскі заявіў: «на бібліятэку ў нас сродкаў не адпушчана», між тым, як па будзяце яны ёсьць. Радыёпрыёмнік разабралі па часткі, а сабраць ніхто ня можа і ён не працуе.

У кепскай пастаноўцы работы дому культуры вінаваты і раённы аддзел нарасьветы,—з боку палітасьветвіпак тара кіраўніцтва амаль зусім няма.

Так далей працягвацца ня можа. Мясцовая партыйная ячэйка павінна ўзяць пад свой кантроль работу дому культуры і накіраваць яе на пасьпяховае выкананьне задач 3-й бальшавіцкай вясны.

А.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

ПАСТАНОВА НАРОДНАГА КАМІСАРЫЯТУ ПРАЦЫ БССР

аб устанаўленьні базісных рэспубліканскіх норм выпрацовак і зьдзельных расцэнак па цагельнай вытворчасьці БССР

У мэтах больш правільнага рэгуляваньня зарплаты рабочых, занятых на цагельных заводах і ізжыцьця ўраўнілаўкі ў аплаце працы НКП БССР ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Увесьці з 1 красавіка 1932 г. па ўсім цагельным заводам БССР далучаныя да гэтага адзіныя нормы выпрацоўкі і зьдзельныя расцэнкі, устанавіўшы наступныя паясныя дзяленьні:

а) да першага пояса аднесьці цагельныя заводы, якія знаходзяцца ў межах гарадоў: Менск, Гомель, Віцебск, Магілеў і Бабруйск;

б) да другога поясу аднесьці гарады: Барысаў, Ворша, Полацк і Мазыр;

в) да трэцяга поясу аднесьці ўсе астатнія мясцовасьці не паказаныя ў першых двух поясах.

2. Паказныя нормы і расцэнкі зьяўляюцца абавязковымі для ўсіх гаспадарчых арганізацый цагельных заводаў у незалежнасьці ад таго, каму гэтыя заводы падпарадкаваны (Аб'яднаньню будматар'ялаў, мясцовай прамысловасьці, Белжылстандартаб'яднаньню, Керамтрэстам, Кустпрамсаюзу і інш.).

3. Удасканаленьне ўстаноўленых норм выпрацоўкі і зьдзельных расцэнак дапушчаецца выключна па дазволу НК Працы па хадайнічаньню гаспадарчых арганізацый і ўзгадненьню з БРК саюзу цэмантна-керамічнай прамысловасьці.

4. Нагляд за правільным ужываньнем устаноўленых норм і зьдзельных расцэнак ускладаецца на мясцовыя органы НК Працы і грамадзкіх інспэктароў працы.

За парушэньне ўстаноўленых норм выпрацоўкі і зьдзельных расцэнак, вінаватыя ў гэтым асобы будуць прыцягнуты да адміністрацыйнай і судовай адказнасьці ва ўстаноўленым парадку.

Нач. сэктару арганізацыі і аздараўленьня умоў працы НКПрацы БССР **Іоззф**
Узгоднена з Ц ПСБ **Адам**.
Аб'яднаньне Белбудматар'ялаў ВСНГ **Ніськевіч.**
БРК саюзу цэмантна-керамічнай прамысловасьці Беларусі **Залуцкі.**

КОРМЫ І РАСЦЭНКІ НА 1932 г. ЦАГЕЛЬНАЙ ВЫТВОРЧАСЬЦІ

а) апрацоўка сыравіны

	НАЗВА ПРАЦЭСУ РАБОТ	Разрад	Тарыф. каэф.	Нормы	1-шы ПОЯС Расцэнкі За 1 ч-д	1-шы ПОЯС Расцэнкі На 1000	2-гі ПОЯС Расцэнкі За 1 ч-д	2-гі ПОЯС Расцэнкі На 1000	3-ці ПОЯС Расцэнкі За 1 ч-д	3-ці ПОЯС Расцэнкі На 1000
1	Фармоўка (гліна тошчая)	5	1 96	2000	4—94	2—47	4—70	2—35	4—47	2—24
2	» (гліна жырная)	5	»	1900	4—94	2—60	4—70	2—45	4—47	2—35
3.	Сталоўка (тошч. глін. п-ст.)	4	1.63	4000	4—11	1—03	3—91	0—98	3—72	0—93
4	» (жырная гл. к-оо)	4	»	4500	4—11	0—91	3—91	0—87	3—72	0—83
5	Засыпка тачкамі	4	»	4500	4—11	0—91	3—91	0—87	3—72	0—83
6.	Закідка (тошч. гліна)	4	»	4500	4—11	0—91	3—91	0—87	3—72	0—83
7.	» (жырная)	4	»	4000	4—11	1—03	3—91	0—98	3—72	0—93
8	Уборка	2	1 25	3500	3—15	0—90	3—00	0—86	2—85	0—81
9.	Ікоўка (да 1,25 м)	4	1.63	3500	4—11	1—17	3—91	1—12	3—72	1—06
10	Навалка ў вагон (ц. гл.)	3	1.49	5000	3—53	0—71	3—36	0—67	3—19	0—64
11	Засыпка ў гліну (ц. гл.)	3	»	30000	3—53	0—12	3—36	0—11	3—19	0—11
12.	Заліўка	3	»	3000	3—53	0—12	3—36	0—11	3—19	0—11
13	Падвозн. глін. на ваг. к форм.	3	»	600	3—53	0—59	3—36	0—56	3—19	0—53
14	Навалка гл. у ваг. (на вс. пр.)	3	»	5 00	3—53	0—71	3—36	0—67	3—19	0—54
15.	Засыпка ў бесшык. (Бабр. пр.)	3	»	71000	3—53	0—17	3—36	0—16	3—19	0—15
16.	» » (Герм. і окт.)	3	»	23000	3—53	0—15	3—36	0—15	3—19	0—14
17.	Заліўка » (Бабр. пр.)	3	»	21000	3—53	0—17	3—36	0—16	3—19	0—15
18	» » (Герм. і окт.)	3	»	23000	3—53	0—15	3—36	0—15	3—19	0—14
19.	Адрэзка на (Бабр. і окт.)	4	1 63	10500	4—11	0—39	3—91	0—37	3—72	0—35
20.	Зьёмка (на ўсіх пр.)	4	»	10500	4—11	0—39	3—91	0—37	3—72	0—35
21	Пром. му дит. (на Бабр. пр.)	1	1.00	21000	2—52	0—12	2—40	0—11	2—38	0—11
22	» » (на Герм. і окт.)	1	»	23000	2—52	0—11	2—40	0—10	2—20	0—10
23.	Вальцаўшчык (Бабр. прэс.)	2	1.25	21000	3—15	0—15	3—00	0—14	2—85	0—13
24.	» (Герм. і окт.)	2	»	23000	3—15	0—14	3—00	0—13	2—85	0—12
25.	Адвоз у стел. нав. на ваг.	3	1 40	3500	3—53	1—00	3—36	0 96	3—19	0—91
26.	Встан. кантр. на марк.	3	1.4	10500	3—53	0 34	3—36	0—30	3—19	0—30
27	» » рукамі	3	1 4	6000	3—33	0—59	3—36	0—56	3—19	0—53
28	Обжыг. (палка на Гофм. печ).	6	2 35	5500	5—92	1—08	5—64	1—03	5—36	0—97
29.	Рассоўка	1	1 00	30000	2—52	0—08	2—40	0—08	2 28	0—08
30	Садка	5	1.95	16000	4—94	0—31	4—70	0—29	4—47	0—28
31.	Загрузка	4	1 63	4000	4—11	1—03	3—91	0—98	3—72	0—93
32	Выгрузка і сартыроўка	5	1.96	3600	4—94	1—41	4—70	1—34	4—47	1—28
33.	Падвозка топліва (мінер. топ)	3	1 40	22000	3—53	0—16	3—36	0—15	3 19	0—14
34.	Драва і торф	3	1.40	11000	3—53	0—32	3—36	0—31	3—19	0—29
35.	Мазка пячэй	2	1.25	22000	3—15	0—14	3—00	0—14	2—85	0—13
36.	Падача сухога сырцу (здат.)	2	»	16000	3—15	0—20	3—00	0—19	2—85	0—18
37.	Абмазка фурт. і ачытк. кам.	2	»	22000	3—15	0—14	3—00	0—14	2—85	0—13

б) норма выпрацоўкі і расцэнк' на копку (кар'ер) гліны на 1932 г

	НАЗВА ПРАЦЭСАЎ	Разрад	Шкала суд-носін	Норма выпрацоўкі	1-ы ПОЯС 1 разр.	1-ы ПОЯС За 1 ч.д.	1-ы ПОЯС Расц. за 1 кб м	2-гі ПОЯС За 1 ч.д.	2-гі ПОЯС Раз. за 1 кб м	3-ці ПОЯС За 1 ч.д.	3-ці ПОЯС Раз. за 1 кб м
1.	Ускрыўка кар'ер і адв. па тачк.	4	1.63	7 кб м	2,52	4,11	0,60	3,91	0,56	3,72	0,53
2.	» адвозкі на ваганетках	3	1.40	10 »	2,52	3,53	0,35	3,36	0,33	3,19	0,32
3.	» кар'ера з адв. на коніх.	3	1.40	12 »	2,52	3 53	0,29	3,36	0, 8	3,19	0,27
4.	Копка глін. з кар'ер мягк. грунта *)	4	1 63	7 »	2,52	3,53	0 59	3,91	0,56	3,72	0,53
5.	» » цьвёрд. грунту	4	1 63	5 »	2,52	4,11	0,82	3,91	0,78	3,72	0,74
6.	» узімку	4	1.63	3 »	2,52	4,11	1,37	3,91	1,30	3,72	1,24
	Адвазка гліны ўсіх выглядаў										
7.	Адвазка гліны з кар'ераў на тачк.	4	1 63	14 »	2,52	4,11	0,30	3,91	0,27	3,72	0,26
8.	» » канем (канагон)	1	1.00	24 »	2,52	2,52	0,11	2,40	0,10	2,28	0,10

Увага 1. К 1-му поясу адносяцца Менск, Гомель, Віцебск, Магілеў і Бабруйск.
К 2-му » » Барысаў, Ворша, Полацк і Мазыр.
К 3-му » » Усе астатнія раёны і гарады.

Увага 2. Да п. 5—в авалкі (ныхты).
Да п. 10 » »
Да п. 14 » »
Да п. 29 на 4 чал. ст. пальшч., яго памочнік і 2 малодшых, норма на 1 чал.—22000 шт.

Увага 3. Адлегласьць на ўсе перасовачныя работы ўстанаўляецца да 125 мтр.

*) Увага: Без адвозкі ў летні час

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

пра рэарганізацыю працоўных сэсій народнага суда ў сэсіі народнага суда па ахове працы і вытворчасьці і пра зьмену „Палажэньня пра судабудаўніцтва", Кодэксу аб працы і Грамадзянска-працэсуальнага кодэксу

Поўнае выкананьне пляну чацьвертага заключнага году пяцігодкі, а таксама задачы, якія стаяць перад рабочай клясай у другую пяцігодку, патрабуюць ад судовых органаў рашучага змаганьня з дэзарганізатарамі вытворчасьці і парушнікамі працоўнага заканадаўства.

Выходзячы з гэтага Цэнтральны выканаўчы камітэт і Савет народных камісараў БССР пастанаўляюць:

Рэарганізаваць працоўныя сэсіі народнага суда ў сэсіі народнага суда па ахове працы і вытворчасьці, перадаўшы на іх вырашэньне, апрача спраў, якія разглядаюцца працоўнымі сэсіямі, наступныя справы:

а) аб злоўжываньні, бесгаспадарчасьці, нядбайных і злосных бюракратычных адносінах службовых асоб прадпрыемстваў аграмаджанага сэктару (да сваіх службовых абавязкаў), калі яны выклікалі невыкананьне або несвячасовае выкананьне пляну ў заданьняў па капітальным будаўніцтве, па выпуску прадукцыі, па зьніжэньні сабекошту, па падвышэньні якасьці прадукцыі і прадукцыйнасьці працы;

б) аб невыкананьні дырэктыў у галіне рабочага забясьпячэньня асобамі, якія павінны гэтыя дырэктывы ажыцьцяўляць на прадпрыемстве;

в) аб парушэньні кіраўнікамі прадпрыемстваў заканаў аб найме і пляновым разьмеркаваньні рабочай сілы;

г) аб парушэньні заканаў аб тэхніцы бясьпекі на прадпрыемстве;

д) непадсудныя дзяржаўнаму арбітражу спрэчкі па заключаных дагаворах і зьдзелках паміж прадпрыемствамі, установамі і арганізацыямі аграмаджанага сэктару.

II

У сувязі з гэтым зрабіць наступныя зьмены ў заканадаўстве БССР:

1. Артыкулы 33 і 34 Палажэньня пра судабудаўніцтва БССР (З. З. БССР 1931 г., № 26, п. 187) запісаць у наступнай рэдакцыі:

«33. Сэсіі народнага суда па ахове працы і вытворчасьці ўтвараюцца ў гарадох Менску, Віцебску, Гомелю, Бабруйску і Магілеве, а таксама ў іншых паселішчах, дзе гэта будзе прызнана патрэбным Вярхоўным судом БССР па ўзгадненьні з Цэнтральным саветам прафэсыянальных саюзаў Беларусі і Выпэйшым саветам народнае гаспадаркі БССР.

У іншых мясцовасьцях, дзе такія сэсіі не арганізаваны, падсудныя ім справы разглядаюцца народным судом».

«34. Сэсіі народнага суда па ахове працы і вытворчасьці дзейнічаюць у складзе народнага судзьдзі і двух народных заседацеляў. Народныя заседацелі выбіраюцца на агульных сходах рабочых і служачых прадпрыемстваў з ударнікаў-рабочых, гаспадарчых і інжынэрна-тэхнічных работнікаў».

2. Артыкулы 169 і 170 кадэксу аб працы запісаць у наступнай рэдакцыі:

«169. Органамі для разгляду спрэчак, якія ўзьнікаюць пры ўжываньні заканадаўства аб працы, зьяўляюцца расцэначныя канфліктныя камісіі, міравыя камеры, пасрэдніцкія суды, сельскія суды і сэсіі народнага суда па ахове працы і вытворчасьці».

«170. Справы аб парушэньнях Кодэксу аб працы і калектыўных дагаворах, якія выклікаюць крымінальную адказнасьць, разглядаюцца ў сэсіях народнага суда па ахове працы і вытворчасьці».

3. Арт. арт. 172 і 173 Кодэксу аб працы скасаваць.

4. Запісаць артыкулы 21-а і 21-б Грамадзянскага працэсуальнага кодэксу (З. З. БССР 1929 г., № 29, паст. 173 і 1931 г. № 33, паст. 218) у наступнай рэдакцыі:

«21-а. Сэсіі народнага суда па ахове працы і вытворчасьці разглядаюць наступныя справы:

а) канфлікты, якія ўзьнікаюць у зьвязку з ужываньнем заканаў аб працы, калектыўных і працоўных дагавораў і правіл ўнутранага парадку;

б) спрэчкі паміж дзяржаўным банкам з аднаго боку і ўстановамі, прадпрыемствамі і арганізацыямі аграмаджанага сэктару—з другога боку, калі гэтыя спрэчкі вынікаюць з апэрацый дзяржаўнага банку;

в) спрэчкі прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый аграмаджанага сэктару па дагаворах аб карыстаньні камунальным паслугамі і спрэчкі, што вынікаюць з чыпучначнай перавозкі;

г) усе іншыя маемасныя спрэчкі паміж прадпрыемствамі, установамі і арганізацыямі аграмаджанага сэктару: на суму ня больш пяці тыс. руб., калі спрэчка вядзецца паміж цэнтральнымі органамі розных саюзных рэспублік або калі бакам у спрэчцы зьяўляецца цэнтральны орган агульна-саюзнага значэньня, і на суму ня больш трох тысяч рублёў, калі бакамі ў спрэчцы зьяўляюцца установы, прадпрыемствы або арганізацыі аграмаджанага сэктару БССР або рэспубліканскі орган прадпрыемства агульна-саюзнага значэньня.

«21-б. Справы паказаныя ў п. «а» арт 21-а гэтага Кодэксу, разглядаюцца сэсіяй народнага суда па ахове працы і зьвяторчасьці толькі ў наступных парадках:

а) калі канфлікт ня быў вырашаны расцэначна-канфліктнай камісіяй, у якую ён быў накіраваны;

б) калі рабочы або служачы перадаў у сэсію канфлікт, які не падлягае абавязковаму разгляду ў расцэначна-канфліктных камісіях;

в) калі пастанова расцэначна-канфліктнай камісіі была скасавана органамі працы ў парадку нагляду.

Справы, паказаныя ў п. «г» арт. 21-а гэтага Кодэксу, калі адказчыкам па справе зьяўляецца Народны каміссарыят або прыроўненая да народных камісарыятаў цэнтральная ўстанова, разглядаюцца сэсіяй народнага суда па ахове працы і зьвяторчасьці толькі ў тых выпадках, калі справа перадана ў сэсію спэцыяльнай пастановай Вярхоўнага суда на падставе арт. 24 гэтага Кодэксу».

Старшыня Цэнтральнага выканаўчага камітэту БССР **А. Чарвякоў.**

Старшыня Савету народных камісараў БССР **М. Галадзед.**

Сакратар Цэнтральнага выканаўчага камітэту БССР **М. Гнілякевіч.**

15 сакавіка 1932 г.
г. Менск.

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" Каса з 1 г. дня	Новы гукавы мастацкі фільм **Дзьве сустрэчы**
КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" Каса ад 12 гадз.	Замежны фільм **Абшарпаныя ветразі**
КІНО „ПРАЛЕТАРЫ"	**Капітанская дачка**

НАБЫВАЙЦЕ АБЛІГАЦЫІ НОВАЕ ПАЗЫКІ!

Пастановай ЦВК і СНК Саюзу ССР ад 7-га лютага 1932 г.

выпушчана

Дзяржаўная Ўнутраная Выйгрышная Пазыка 1932 году

Пазыка выпушчана ў аблігацыях каштоўнасьцю ў 100 і 25 рублёў на аг